КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ № 42 (218) ◂ 19 лістапада ◂ 2010 г.
www.novychas.org

# Новы Час

ISSN 2218-2144



## ЭВІТА ВЯРНУЛАСЯ

Стар. 12

## ДЗЯЛЬБА КАБАНЧЫКА

Урад Беларусі плануе да 2013 года завяршыць акцыянаванне ўсіх дзяржаўных прадпрыемстваў

Стар. 5

## РАСПРАНУЦЦА — І Ў ПАРЛАМЕНТ

Скандальная арганізацыя FEMEN мае намер далучыцца да грамадскіх пратэстаў у Беларусі. Ці трэба беларускай апазіцыі радавацца з'яўленню новага саюзніка?

Стар. 11

## ЛІСТАПАД: ПЕРШАЯ ВОСЕНЬ ЮНАЦТВА

Стар. 14

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**

## У ТРЫВОЖНЫМ ЧАКАННІ

Нарыс Сяргея Нікалюка з цыклу «Азбука паліталогіі»

МЕРКАВАННЕ

# ЭФЕКТ МАЯТНІКА

Вольга ХВОІН

**Беларускі трэнд схіліўся ў бок Еўропы з падачы саміх еўракамісараў. Яны гатовыя адысці ад мараторыя на кантакты з «апошняй дыктатурай Еўропы», як і ад падобнага вызначэння палітычнага рэжыму ў Беларусі. Палітычны дэсант з Еўрасаюза настойліва атакуе сінявокую, а яна і рада пасунуць акцэнты з усходу на захад.**




Еўрасаюз удала карыстаецца «вайной» паміж Беларуссю і Расіяй ды робіць крокі ў бок наладжвання адносінаў, умацавання пазіцый па сваёй усходняй мяжы. Калі раней пазіцыя ЕС была прынцыповай і ўльтыматыўнай, то цяпер ідзе гаворка не пра выкананне патрабаванняў, а пра жаданне бачыць прагрэс у пэўных сферах — выбарчым працэсе, свабодзе сходаў, выкананні правоў чалавека. Што будзе выступаць меркаю гэтага прагрэсу — не зразумела. На падобныя пытанні пасланцы Захаду імкнуцца пазбегнуць канкрэтнага адказу. Прагрэс — і кропка, а якім ён будзе, быццам і не важна. Не важна ўжо і тое, што на чале Беларусі застанецца Аляксандр Лукашэнка.

Больш таго, палітычны бамонд другі тыдзень не можа супакоіцца ад прызнання літоўскага прэзідэнта Далі Грыбаўскайтэ на сустрэчы з еўрапейскімі пасламі, што была прысвечаная ўнутраным пытанням Літвы і Еўрасаюза. Прэзідэнт Літвы заявіла, што ўпэўненая ў перамозе Лукашэнкі на прэзідэнцкіх выбарах і ўхваляе гэта. «Лукашэнка — гарант палітычнай і эканамічнай стабільнасці Беларусі, яе незалежнасці. Мы не хочам, каб наша суседка стала другой Расіяй», — заявіла спадарыня Грыбаўскайтэ. Беларускую апазіцыю палітык назвала «несур'ёзнай», без шанцаў «на любых выбарах». «Лукашэнка мог бы выйграць, набраўшы 99% галасоў, але ён пераможа толькі з 75%, каб дагадзіць ЕС», — выказалася прэзідэнт Літвы.

Дэпутат германскага Бундэстага, кіраўнік ведамства федэральнага канцлера, федэральны міністр па асаблівых даручэннях Рональд Пофала падчас свайго візіту некалькі разоў паўтарыў, што ЕС будзе паважаць выбар беларускага народа. І выбар гэты даволі прадказальны ва ўмовах няроўнага доступу да СМІ (а калі больш дакладна, то нядопуску апазіцыйных палітыкаў да дзяржаўных і, адпаведна, масавых медыяў, бо ў зачышчанай за больш чым дзясятак гадоў прасторы недзяржаўныя СМІ, мякка кажучы, у беспрагляднай яме), асабліва і мудрыць нічога ўладам не патрэбна, каб захаваць статус-кво. Выглядае на тое, што захаванне расстаноўкі сілаў задавальняе Еўропу — кіраўнік Беларусі можа і не вельмі прадказальны, але яго дзеянні, жаданні больш-менш зразумелыя.

Еўропа цяпер хоча мець эканамічнага партнёра ў асобе Беларусі, на што ў прынцыпе больш чым згоднае беларускае кіраўніцтва. Направа і налева раздаюцца абяцанні адкрытасці эканомікі да інвестыцый, супрацоўніцтва, мае месца апантанасць міжнароднымі рэйтынгамі па ўмовах вядзення бізнесу. У прывітальным слове Аляксандра Лукашэнкі ўдзельнікам Беларускага інвестыцыйнага форума ў Франкфурце-на-Майне гаварылася, што «ўсе сферы беларускай эканомікі адкрытыя для інвестыцый». Выглядае на тое, што жаданні бакоў так ці інакш сышліся. Не без дапамогі знешніх фактараў, натуральна.

Аляксандру Лукашэнку ЕС дае прываблівыя абяцанні за правядзенне адкрытых і дэмакратычных выбараў выдзеліць 3 мільярды еўра на працягу трох гадоў (праўда, у якой форме, не было агучана), кіраўнік польскага знешнепалітычнага ведамства Радаслаў Сікорскі падчас свайго візіту ў Мінск заявіў, што зняў сваё вета на ўдзел Беларусі ў Паўночным вымярэнні ЕС, Еўракамісія рэкамендавала Савету міністраў ЕС упаўнаважыць Камісію для пачатку перагаворнага працэсу з Беларуссю па дамовах аб спрашчэнні працэдур афармлення кароткатэрміновых віз і аб рэадмісіі. Ледзяны маналіт адносінаў пачынае імкліва таяць.

У такіх умовах беларускай апазіцыі варта было б задумацца, што ёй свеціць маргіналізацыя ўжо не толькі на ўнутраным полі, але і на знешнім. Увесь гэты час яна «выязджала» на самаізаляцыі беларускага рэжыму. Але калі ідзе дыялог з уладамі, то натуральны працэс — пасоўванне на другі план апазіцыі, тым больш калі яна нічога не вырашае і ні на што не ўплывае.

Еўрапейскія пасланнікі не настойваюць на вылучэнні «адзінага» кандыдата ад апазіцыі на бліжэйшых прэзідэнцкіх выбарах, не апелююць да неабходнасці кансалідацыі сілаў, бо гэта выглядала б ціскам на ўнутраную палітыку краіны. Але раздробленасць апазіцыйных сілаў, пастаяннае перацягванне коўдры і дзяльба незабітага мядзведзя выглядаюць як мінімум смешна, а то і проста кампраметуюць. Урэшце, Еўропа — не краіна Оз з дзівосным чараўніком, які можа надзяліць герояў гісторыі адвагай і мудрасцю.

РЭГІСТРАЦЫЯ

# ДЗЕСЯЦЬ АДВАЖНЫХ

**18 лістапада, як і чакалася, ЦВК зарэгістравала кандыдатамі ў прэзідэнты Беларусі 10 чалавек.**



Photo.ByMedia.Net

Пасля праверкі сабраных подпісаў права стаць кандыдатамі атрымалі Рыгор Кастусёў, Аляксандр Лукашэнка, Алесь Міхалевіч, Уладзімір Някляеў, Яраслаў Раманчук, Віталь Рымашэўскі, Андрэй Саннікаў, Мікалай Статкевіч, Віктар Цярэшчанка, Дзмітрый Ус.

ЦВК знайшоў неадпаведнасці ў запоўненых дэкларацыях шэрагу кандыдатаў, але нікому з гэтай прычыны не было адмоўлена ў рэгістрацыі. Уладзімір Някляеў, напрыклад, забыўся ўказаць, што валодае 20 акцыямі «Парытэтбанка». «Уладзімір Някляеў быў самым актыўным на этапе збору подпісаў. Мы бачылі яго пікеты амаль ва ўсіх гарадах, часам эпатажныя заявы, таму не хацелася б, каб у шэрагах кандыдатаў быў такі прабел ад самага пачатку выбарчай кампаніі», — сказала Лідзія Ярмошына.

Пасведчанні кандыдатам у прэзідэнты Беларусі былі ўручаныя ў Палацы рэспублікі. На пасяджэнні ЦВК адсутнічалі Уладзімір Някляеў, Аляксандр Лукашэнка і Віталь Рымашэўскі, таму пасведчанні на іх імя атрымлівалі даверaныя асобы. Кандыдаты і іх даверaныя асобы мелі магчымасць выступіць з невялікай прамовай.

Здзівіў выступ Алеся Міхалевіча. «Я вельмі задаволены тым, у якіх умовах праходзіў этап збору подпісаў. Ёсць усе падставы гаварыць пра сур'ёзную дэмакратызацыю на гэтым этапе, у чым, безумоўна, ёсць і вялікая заслуга Цэнтрвыбаркама. Разам з тым выказваю ўпэўненасць, што толькі дзень галасавання і падлік галасоў будуць сапраўдным індыкатарам дэмакратызацыі»,— заявіў былы намеснік старшыні партыі БНФ.

Цяперашні намеснік старшыні партыі БНФ Рыгор Кастусёў наадварот нязгодны з вызначэннямі дэмакратычнай і ліберальнай выбарчай кампаніі. «Кандыдаты ад апазіцыйных партый пазбаўленыя магчымасці агітацыі, бо ў краіне няма свабоды слова. Недзяржаўныя газеты не маюць магчымасці распаўсюду праз манапольную сетку Белсаюздруку. Напрыклад, газета «Новы час» не можа распаўсюджвацца праз шапікі «Белсаюздруку». Я накірую сваю праграму ў гэту газету, і буду патрабаваць, каб яна мела доступ да свабоднага распаўсюду, як і іншыя выданні», — заявіў палітык.

Трэба прызнаць, што найбольш падрыхтаваным выглядаў Андрэй Саннікаў. «Нашу краіну ў Еўропе называюць апошняй дыктатурай. Гэта гучыць ганебна, але ёсць праўдай. І мы ведаем, калі Беларусь стала дыктатурай — 14 лістапада 1996 года, калі быў насільна зрынуты з пасады старшыні ЦВК Віктар Ганчар. Праз тры гады ён быў выкрадзены. Міжнародная супольнасць падазрае ў дачыненні да яго выкрадання вышэйшых службовых асобаў Беларусі», — сказаў палітык у сваім выступе.

ЦВК прыняў «рэвалюцыйную» (па вызначэнню Лідзіі Ярмошынай) пастанову, што сёлета будуць праводзіцца тэледэбаты паміж кандыдатамі ў прэзідэнты. Па жаданню кандыдатаў, яны могуць быць не ў прамым эфіры, а ў запісе.

КАНФЕРЭНЦЫЯ

# МІНУЛАЕ І БУДУЧЫНЯ

Уладзімір СІЎЧЫКАЎ

**У Варшаве на базе Інстытута грамадзянскай прасторы і публічнай палітыкі пры Універсітэце Лазарскага, які з'яўляецца адным з вядучых прыватных універсітэтаў у Польшчы, прайшла міжнародная канферэнцыя «Вяртанне ў Еўропу: мінулае і будучыня Беларусі».**

Мультыдысцыплінарная трохдзённая канферэнцыя была прысвечана перакрыжаванням беларускай і еўрапейскай гісторыі, а таксама іх уплыву на сучасныя падзеі. Удзел у ёй узялі даследчыкі, практыкі ў галіне гістарычнай адукацыі, грамадскія актывісты і выдаўцы з Беларусі, краінаў Еўрапейскага саюза і Злучаных Штатаў Амерыкі. У тым ліку Juliusz Madej, прэзідэнт Універсітэта Лазарскага, Jerzy Stepien, дырэктар Інстытута грамадзянскай прасторы і публічнай палітыкі, куратар канферэнцыі Ірына Віданава.

На пленарных пасяджэннях пасля ўступнага слова Роджэра Патоцкага, дырэктара еўрапейскіх праграм, National Endowment for Democracy (ЗША), былі прадстаўлены асноўныя акадэмічныя канцэпцыі, сучасныя навучальныя метадалогіі, міжнародныя даследчыя і адукацыйныя праекты, а таксама апошнія публікацыі па тэме Беларусі і Еўропы. Прагучалі і былі абмеркаваныя шмат дакладаў як беларускіх, так і замежных даследчыкаў — Adam Kozuszowski (Польская акадэмія навук, Польшча), Леаніда Смілавіцкага (Цэнтр дыяспары пры Тэль-Авіўскім універсітэсе, Ізраіль), David Marples (University of Alberta, Канада), Алега Латышонка (Беластоцкі ўніверсітэт, Польшча), Maria Paula Survilla (Southwestern College, ЗША), Алеся Краўцэвіча (Беларускае гістарычнае таварыства, Беларусь), Тамары Мацкевіч (Nastaunik.info).

Бралі ўдзел у працы форума і такія знаныя гісторыкі, выдаўцы і грамадскія дзеячы, як Stephan Malerius (Konran Adeneaur Stiftung, Літва), Алег Дзярновіч, Ірына Кашталян, Любоў Козік, Аляксей Літвін, Андрэй Масквін, Генадзь Сагановіч, Алесь Смалянчук, Аляксандр Пашкевіч, Сяргей Токць, Мікола Хаўстовіч, Ян Шумскі, Яраслаў Іванюк, Валер Булгакаў, Кузьма Козак, Алена Макоўская, Алесь Лагвінец і іншыя.

На пяці працоўных секцыях («Еўрапейская гісторыя і грамадства: як яны звязаныя?», «Грамадзянскія кампаніі і мультымедыйныя платформы як інструменты па ўдасканаленні гістарычнай адукацыі ў Беларусі», «Адукацыйныя ўстановы і грамадзянскія ініцыятывы: магчымасці супрацоўніцтва» і іншыя) былі разгледжаны важныя гістарычныя тэксты, якія варта перакласці і зрабіць даступнымі беларускай грамадскасці, адбыліся прэзэнтацыі міжнародных праектаў па навуковых стажыроўках, стыпендыях і выдавецкіх ініцыятывах, былі абмеркаваныя магчымасці развіцця далейшай супрацы паміж беларускімі і замежнымі гісторыкамі, а таксама выпрацаваныя практычныя рэкамендацыі.

З НАГОДЫ

# МАЛЕНЬКІ ЮБІЛЕЙ

Васіль КІСЛЯК

**Колькасць артыкулаў у беларускім раздзеле Вікіпедыі дасягнула 25 тысяч.**

Гэты буйны інтэрнэт-рэсурс змяшчае карысныя звесткі па гісторыі і культуры Беларусі, яе адміністрацыйным падзеле, геаграфіі, жывёльным свеце, помніках архітэктуры і вядомых асобах краіны.

Свабодная энцыклапедыя з'яўляецца некамерцыйнай ініцыятывай, доступ да яе ведаў адкрыты для ўсіх, хто карыстаецца інтэрнэтам. Яна не ставіць палітычных, нацыянальных ці рэлігійных мэтаў і ў дадатак да гэтага не размяшчае на сваіх старонках рэкламы. У выніку Вікіпедыя робіцца надзвычай папулярным рэсурсам, і па частаце наведванняў яна трымае ў гэтыя дні сёмае месца ў свеце.

Беларускі раздзел працуе са жніўня 2006 года. У сакавіку 2008-га быў створаны 10-тысячны артыкул, у маі 2010-га — 20-тысячны. Сёння артыкулы на беларускай мове ствараюць 160 удзельнікамі, усе яны працуюць на добраахвотнай аснове.

Беларуская Вікіпедыя хутка набірае моц праз няхуткае стварэнне новых артыкулаў, паляпшэнне ўжо існуючых і актыўныя дзеянні па іх сістэматызацыі і звязнасці. Асноўнымі катэгорыямі раздзела з'яўляюцца грамадства, гісторыя, культура, беларусы, рэлігія, навука, прырода і тэхніка.

У параўнанні з адгалінаваннямі Свабоднай энцыклапедыі на іншых мовах, наш раздзел на працягу апошняга года вызначаецца дынамічным ростам і зладжанай мэтанакіраванай працай.

ПРЭЗЕНТАЦЫЯ

# ПАМЯЦЬ ПРА ЗНІКЛЫХ

Генадзь КЕСНЕР

**16 лістапада, у Дзень беларускай салідарнасці, адбылася прэзентацыя кнігі вядомага беларускага пісьменніка, журналіста і драматурга Уладзіміра Халіпа «Мы помнім».**

У гэтай кнізе пра сваіх блізкіх і сяброў, якія былі выкрадзеныя ў 1999–2000 гадах, распавядаюць жонкі, дзеці і паплечнікі экс-намесніка старшыні Вярхоўнага Савета Віктара Ганчара, яго сябра прадпрымальніка Анатоля Красоўскага, былога міністра ўнутраных спраў Беларусі генерала Юрыя Захаранкі, аператара расійскага тэлеканалу ОРТ, сябра Беларускай асацыяцыі журналістаў Зміцера Завадскага. Ёсць тут і ўспаміны пра віцэ-спікера ВС 13-га склікання Генадзя Карпенку, смерць якога ў 1999 годзе і дагэтуль выклікае шматлікія пытанні ў дэмакратычным асяродку.




На прэзентацыі прысутнічалі шмат вядомых у краіне і па-за яе межамі людзей: першы кіраўнік незалежнай Беларусі Станіслаў Шушкевіч, былы пасол Беларусі ў Германіі Пётра Садоўскі, мастак Аляксей Марачкін, праваабаронцы Гары Паганяйла, Алег Волчак, Людміла Гразнова, палітыкі Андрэй Саннікаў, Вячаслаў Сіўчык, Зміцер Дашкевіч, былы мэр Мінска і палітвязень Міхаіл Марыніч, прадстаўнікі дыпламатычнага корпуса, маці і жонка зніклага журналіста Вольга Рыгораўна і Святлана Завадскія, шматлікія журналісты.

468-старонкавая кніга выдадзена на беларускай, рускай і англійскай мовах. Выданне ўтрымлівае шмат фотаздымкаў, якія дэманструюць згаданых вышэй асоб не толькі як палітычных і грамадскіх дзеячаў, але і проста як звычайных людзей.

«Я ведаю, чаго каштавала родным зніклых зноў перажываць тыя падзеі, распавядаючы пра сваіх сваякоў і сяброў, зноў праз дзесяць гадоў вяртацца ў тыя дні. Я думаю, што гэта кніга не будзе марнай, таму што тут сабраны не сенсацыйныя адкрыцці, не крымінальныя расследаванні, — адзначыў Уладзімір Халіп. — Як сказаў праваабаронца Гары Паганяйла, цяпер застаецца толькі адно — юрыдычная працэдура, якая ўсё ніяк не адбудзецца, і таму яшчэ не пакараны злачынцы, якія ходзяць па зямлі, іх паціскаюць рукі, з імі вітаюцца, з імі размаўляюць, з імі вядуць перамовы, але гэта скончыцца, бо ніколі не бывае, каб гэткае засталося беспакараным… Такое адбывацца не павінна нідзе. У Еўропе такое адбывацца не павінна тым болей», — падкрэсліў аўтар кнігі «Мы помнім».

Ад імя родзічаў зніклых да прысутных звярнулася Ірына Красоўская — адзін з арганізатараў выдання кнігі «Мы помнім», жонка Анатоля Красоўскага.

Яна шчыра падзякавала ўсім, «хто прыйшоў на прэзентацыю, усім, хто быў побач з намі ўсе гэтыя цяжкія гады». «Я хачу сказаць «дзякуй» усім, хто захоўвае і захоўвае памяць пра нашых родных і блізкіх. Адзінаццаць гадоў — гэта вельмі вялікі тэрмін, — адзначыла Ірына Красоўская. — Свет змяняецца, мы змяняемся, не мяняюцца толькі тыя, хто ўжо больш не з намі — Віктар Ганчар, Анатоль Красоўскі, Зміцер Завадскі, Юры Захаранка і Генадзь Карпенка. Яны застануцца такімі ж, якімі мы іх ведалі адзінаццаць гадоў таму. Яны застануцца такімі і ў кнізе, якую мы стварылі, таму яна так і завецца «Мы помнім». Гэта кніга аб памяці і гэта кніга аб любові. Тут 24 апавяданні, 24 споведзі жонак, дзяцей, родных, блізкіх і калег зніклых, і бальшыня з тых, хто стаў аўтарамі кнігі, сёння тут, за што ім вялікі дзякуй».

Гэта была ўжо трэцяя прэзентацыя кнігі «Мы помнім», першыя дзве адбыліся ў Нарвегіі (Осла) і ЗША (Нью-Ёрк). Прычым, па трагічным супадзенні, прэзентацыя ў сталіцы Нарвегіі адбывалася ў дзень, калі на сваім лецішчы ў пятлі быў знойдзены заснавальнік і кіраўнік сайта «Хартыя'97» журналіст Алег Бябенін. Вёў рэй кіраўнік «Свабоднага тэатра» Мікалай Халезін, колькі добрых словаў пра кнігу Уладзіміра Халіпа сказалі мэнэджар «Свабоднага тэатра» Наталля Каляда і лідэр грамадзянскай кампаніі «Еўрапейская Беларусь» Андрэй Саннікаў.

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# ВЯЛІКАЯ ГУЛЬНЯ



Сяргей САЛАЎЁЎ

**Нейкая вялікая гульня разварочваецца зараз вакол Беларусі. На фоне маўчання Расіі, якая ўрэшце, спыніла паказы розных «Хросных бацькаў», у краіну штосьці зачасцілі розныя эмісары з Захаду. Тыдня не праходзіць, каб сюды не прыехаў нехта з «краінаў NATO».**

Вось і на гэтым тыдні да нас завіталі еўракамісар па пытаннях пашырэння і Еўрапейскай палітыкі добрасуседства Штэфан Фюле, намеснік памочніка дзяржсакратара ЗША Дэніэл Расел ды сенатары з Чэхіі. Прычым праграма візіту ва ўсіх амаль аднолькавая: сустрэчы з міністрам замежных спраў Беларусі Сяргеем Мартынавым, прэтэндэнтамі ў прэзідэнты ад апазіцыйных палітычных партый і дэмакратычных рухаў, а таксама з прадстаўнікамі няўрадавых арганізацый, якія праводзяць назіранне за выбарамі.

Здаецца, такой актыўнасці не было ніколі, нават перад прэзідэнцкімі выбарамі 2006 года. Можа, Еўропа сапраўды мае намер адарваць Беларусь ад Расіі? Але такія спадзяванкі нейкія недарэчныя.

Тым больш, што беларускі бок ужо атрымаў шмат прэферэнцый. Прыкладам, Фюле абмеркаваў з Мартынавым сумесны прамежкавы план, падрыхтаваны Еўракамісіяй для Беларусі. Паводле яго слоў, дадзены дакумент уяўляе сабой «спробу пераадолець адсутнасць глыбокіх адносін» паміж Беларуссю і Еўрасаюзам.

Між іншым, план існуе, а вось у стандартах, якія Фюле выклаў для беларускага боку, мала што зроблена. Еўрасаюз ужо называў сферы, у якіх хацеў бы бачыць прагрэс. Гаворка ідзе, у прыватнасці, пра рэгістрацыю кандыдатаў, фармаванне тэрытарыяльных камісій, датэрміновае галасаванне, падлік галасоў, свабодны доступ да СМІ і забеспячэнне свабоды сходаў.

Між тым, нават на «агітацыйныя» залі для сходаў трэба падаваць заяўку, якую разглядаюць цягам 15 дзён. Улічваючы, што ўся агіткампанія цягнецца крыху больш за тры тыдні, якая можа быць свабода сходаў? Які можа быць «свабодны доступ да СМІ», калі БТ адмовілася ад правядзення дэбатаў кандыдатаў на прэзідэнта ў прамым эфіры?

А тым часам пэўную паўзу ў барацьбе за беларускі электарат узялі і некаторыя прэтэндэнты на пасаду прэзідэнта, і паехалі самі размаўляць з еўрадэпутатамі. Прыкладам, Віталь Рымашэўскі вырашыў нават прапусціць уручэнне пасведчання кандыдата ў прэзідэнты. 16–17 лістапада ён у складзе дэлегацыі БХД знаходзіўся з двухдзённым візітам у Нарвегіі. Падчас візіту сустаршыня БХД сустрэўся з дэпутатамі парламенту Нарвегіі, дэпутатамі ПАСЕ парламенту ад гэтай краіны, а таксама з дзяржаўным сакратаром па міжнародных справах Нарвегіі.

Перад ад'ездам Рымашэўскі звярнуўся да міжурадавай кааліцыі «Супольнасць дэмакратый» з заклікам далучыцца да назірання за прэзідэнцкімі выбарамі ў Беларусі, што маюць адбыцца 19 снежня. Рымашэўскі просіць «забяспечыць адэкватную місію назірання непасрэдна перад і адразу пасля выбараў у нашай краіне, а таксама падрыхтаваць аб'ектыўны, аўтарытэтны аналіз прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі».

«Забеспячэнне назірання за выбарамі як мага большай колькасці незалежных міжнародных арганізацый дасць дадатковую гарантыю кантролю за празрыстасцю выбарчага працэсу, што, несумненна, паслужыць інтарэсам Беларусі і дэмакратычнай беларускай грамадзянскай супольнасці», — гаворыцца ў звароце Рымашэўскага.

Калі да звароту прыслухаюцца, то гэта будзе моцны ход, бо «Супольнасць дэмакратый» — гэта міжурадавая кааліцыя краін, якая імкнецца пашыраць дэмакратычныя прынцыпы і ўстановы ў свеце. Яна створана ў 2000 годзе і ўключае больш за 100 дзяржаў свету. А 100 дзяржаваў — гэта вам не СНД ці АБСЕ.

А 18 лістапада — акурат у дзень рэгістрацыі — Рымашэўскі выступіць на пасяджэнні Камісіі па палітычных пытаннях Парламенцкай Асамблеі Рады Еўропы ў Парыжы. На пасяджэнні сярод іншых пытанняў будзе абмяркоўвацца сітуацыя ў Беларусі.

Уладзімір Някляеў жа выправіўся ў Прагу, дзе сустрэўся з міністрам замежных спраў Чэхіі Карлам Шварцэнбергам.

Тэмамі абмеркавання сталі будучыня Беларусі, перадвыбарчая атмасфера ў дзяржаве, патэнцыйныя варыянты развіцця падзей у залежнасці ад сцэнару выбараў. У тым ліку Някляеў казаў пра небяспеку стварэння ў Беларусі «кіруемай дэмакратыі», што знішчыць усе магчымасці для развіцця краіны. Таксама чэшскі міністр даведаўся, што беларуская ўлада зараз толькі імітуе дэмакратызацыю і лібералізацыю.

Але барацьбу за імідж Беларусі не спыняюць і беларускія ўлады. Беларуская эканоміка — падрыхтаваная пляцоўка для прыцягнення замежных інвестыцый, заявіў прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі, выступаючы 17 лістапада на Беларускім інвестыцыйным форуме ў Франкфурце-на-Майне.

Паводле слоў прэм'ера, у Беларусі праведзена вялікая праца па змяненні заканадаўства для паляпшэння ўмоў вядзення бізнесу і спрыяльнага інвестыцыйнага клімату. Сідорскі, у прыватнасці, звярнуў увагу на спрашчэнне працэдуры адкрыцця бізнесу. «Затраты на адкрыццё бізнесу зніжаныя ў дзевяць разоў, патрабаванні да статутных фондаў — у тры разы», — сказаў ён. У выніку, сцвярджае прэм'ер, адкрыць бізнес у Беларусі можна за пяць дзён і ажыццявіць усяго пяць працэдур. Для параўнання Сідорскі прывёў Расію, дзе гэтыя паказчыкі складаюць 30 дзён і дзевяць працэдур, а таксама Украіну — 27 дзён і дзевяць працэдур.

Вялікія змяненні, адзначыў ён, адбыліся таксама ў частцы спрашчэння падатковага заканадаўства і спрашчэння падатковай нагрузкі на бізнес. З 1 студзеня 2011 года ў Беларусі будуць дзейнічаць толькі пяць асноўных падаткаў, сказаў Сідорскі.

Было б добра, калі б гэта ён сказаў нашым, беларускім прадпрымальнікам. Цікава, яны б яго паслухалі або адразу паслалі туды, куды Макар цялятаў не ганяў? Бо ўжо колькі нашы прадпрымальнікі б'юцца з урадам за тое самае, пра што наіўным немцам казаў Сідорскі — і за змякчэнне падатковай сістэмы, і за спрошчанае адкрыццё бізнесу, і за змякчэнне ўсялякіх «працэдур». Дзясяткі беларускіх прадпрымальнікаў з 2007 года адседзелі за гэтыя патрабаванні суткі адміністратыўнага арышту, атрымалі шматлікія штрафы, а некаторыя нават пайшлі па крымінальных артыкулах.

Ці пасадзяць беларускія ўлады якога-небудзь наіўнага немца, як Мікалая Аўтуховіча?

## ФІГУРЫ ТЫДНЯ

### БАТЭ



Ганар беларускіх заўзятараў — Барысаўскі клуб БАТЭ — за тур да фінішу стаў уладальнікам залатых медалёў чэмпіянату Беларусі па футболе. БАТЭ стаў чэмпіёнам пяты раз запар і сёмы раз за час выступу ў вышэйшай лізе (1999, 2002, 2006–2010). Па гэтым паказчыку барысаўчане зраўняліся з цяпер ужо былым рэкардсменам мінскім «Дынама».

На прэс-канферэнцыі пасля матчу галоўнага трэнера БАТЭ Віктара Ганчарэнку спыталі, не ці стамілася яго каманда ад перамог? «Не. Кожная перамога, кожнае чэмпіёнскае званне добрае па-свойму. Сама аўра каманды накіроўвае нас да перамог. Мы выйгралі абсалютна ўсё ў гэтым сезоне і пры гэтым яшчэ працягваем шлях у Лізе Еўропы. Тут трэба аддаць належнае хлопцам», — адказаў Віктар Ганчарэнка.

БАТЭ дэбютаваў у еўракубках у 1999 годзе. Сезон–2008 стаў лепшым у гісторыі футбольнага клуба. Пасля перамогі над бельгійскім клубам «Андэрлехт» і балгарскім «Леўскі» беларусы выйшлі ў групавы турнір Лігі чэмпіёнаў. Іх супернікамі па групе сталі выключна гранды еўрапейскага футбола — «Рэал» (Мадрыд), «Ювентус» (Турын) і «Зеніт» (Санкт-Пецярбург). Тады беларускі клуб паказаў высокі ўзровень, згуляўшы ўнічыю з «Ювентусам» і «Зенітам» і мінімальна саступіўшы ў ліку «Рэалу». У сезоне–2010 футбалісты БАТЭ другі год запар выйшлі ў групавы этап Лігі Еўропы.

### СЯРГЕЙ ЛАЗНІЦА



Стужка рэжысёра, які паходзіць з Беларусі, Сяргея Лазніцы «Шчасце маё» атрымала галоўны прыз 17-га Міжнароднага кінафестывалю «Лістапад». Сюжэт карціны пра дальнабойніка, які заблукаў у раёне Смаленску. Ён сустракаецца са сквапнымі міліцыянтамі, разбойнікамі, малалетняй прастытуткай, губляе ўласную памяць. «На фестывалі, падчас прагляду, некаторыя гледачы — пераважна старога веку — заклікалі застрэліць рэжысёра, — піша кінакрытык Андрэй Расінскі. — Але для Лазніцы прынцыповым было стварыць партрэт савецкага чалавека, сэрца якога знішчана нянавісцю».

Старшыня праўлення камерцыйнага банку «BelSwissBank» патлумачыў, чаму на фестывалі «Лістапад» не быў уручаны прыз банку за фільм, «што выклікаў у душы светлыя і добрыя пачуцці». «Мяне шчыра расчаравала, што галоўны прыз кінафэсту атрымаў фільм «Шчасце маё», які выклікае ў душы пераважна негатыўныя эмоцыі нянавісці, несправядлівасці і агрэсіі. Няўжо бессэнсоўныя забойствы працаўнікоў ДАІ і ўсіх вакол — гэта выхад для галоўнага героя фільма? — пракаментаваў Віталь Казбанаў. — Нават фэставае кіно, на мой погляд, павінна выклікаць пазітыўныя эмоцыі і вучыць чамусьці добраму і, адпаведна, знаходзіць водгук у сэрцах гледачоў». У розныя гады «BelSwissBank» неаднаразова з'яўляўся генеральным спонсарам, афіцыйным спонсарам і партнёрам кінафэсту «Лістапад».

### АНАТОЛЬ СІДАРЭВІЧ



Новаабранага старшыню апазіцыйнай Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада) забракаваў Мінюст. Мінюст прызнаў нелегітымным XIII з'езд партыі, які прайшоў 10 кастрычніка. У міністэрства 15 кастрычніка паступіў зварот двух сябраў БСДП (Грамада) адносна падрыхтоўкі і правядзення з'езду партыі, перадае БелаПАН. Міністэрства выявіла, што колькасны склад абраных дэлегатаў з'езду не адпавядае вызначанаму цэнтральным камітэтам. Апроч гэтага, на з'езд наогул не абіраліся дэлегаты ад сябраў БСДП(Г), якія працуюць на тэрыторыі Гомельскай і Магілёўскай абласцей. Ёсць у Міністэрстве юстыцыі прэтэнзіі і да дакументаў з'езду.

А абранне на з'ездзе Анатоля Сідарэвіча, які раней выйшаў з БСДП (Грамада), кіраўніком гэтай партыі супярэчыць ч. 12 арт. 12 закона «Аб палітычных партыях». У сувязі з гэтым Міністэрства юстыцыі пастанавіла прызнаць, што рашэнні з'езду не маюць юрыдычнай сілы. Былы старшыня БСДП (Грамада) Анатоль Ляўковіч пасля з'езду заявіў, што «ўпершыню за гісторыю партыі не лідэрам быў абраны беспартыйны чалавек», і не пагадзіўся з рашэннем з'езду. Разам з тым фігура Ляўковіча спрэчная і неадназначная. Яго ў палітычных колах абвінавачваюць у кулуарных інтрыгах і непрыстойным змяшчэнні з пасады старшыні партыі ў 2008 годзе Аляксандра Казуліна, які на той час знаходзіўся ў турме.

ГЕАПАЛІТЫКА

# ШТЭФАН ФЮЛЕ ЗНОЎ НАВЕДАЎ БЕЛАРУСЬ

Генадзь КЕСНЕР

**15 лістапада ўжо другі раз за бягучы год Мінск наведаў еўрапейскі камісар па пытаннях пашырэння Еўрапейскага саюза і Еўрапейскай палітыцы суседства Штэфан Фюле. Падчас свайго непрацяглага наведвання беларускай сталіцы еўрапейскі палітык сустрэўся з міністрам замежных спраў Беларусі Сяргеем Мартынавым, з прадстаўнікамі грамадзянскай супольнасці, а таксама з кіраўніком групы назіральнікаў на прэзідэнцкіх выбарах Бюро па дэмакратычным інстытутам і правам чалавека АБСЕ (БДіПЧ АБСЕ) Гертам Арэнсам.**



У журналістаў адразу ўзнікла пытанне, чаму спадар Фюле даў прэс-канферэнцыю яшчэ да сустрэчы з кіраўніком беларускага знешнепалітычнага ведамства, але гэта, відаць, была такая задума, хоць яе сэнс так і застаўся незразумелым. Таму што на брыфінгу (менавіта так была азначана сустрэча еўракамісара з прадстаўнікамі мас-медыя) Штэфан Фюле пазбег адказаў на некаторыя пытанні, маўляў, яму не хацелася, каб міністр Мартынаў даведаўся пра тое, з якімі прапановамі еўрачыноўнік прыбыў у Беларусь, са сродкаў масавай інфармацыі.

Штэфан Фюле адразу заявіў, што мэтай яго візіту з'яўляецца «падтрымка народа Беларусі напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў». Адным з важных momantaў, па словах спадара Фюле, была яго сустрэча з прадстаўнікамі грамадзянскай супольнасці, у якой толькі з беларускага боку прынялі ўдзел 52 чалавекі. Дарэчы, на гэтай сустрэчы, як потым і на прэс-канферэнцыі, прысутнічалі кіраўнік прадстаўніцтва Еўракамісіі ў Украіне Жазэ Мануэль Пінту Тэйшэйра, кіраўнік прадстаўніцтва Еўрасаюза ў Беларусі Эрык Хольцапфель, некаторыя іншыя еўрачыноўнікі.

Як падкрэсліў Штэфан Фюле, сустрэча з актывістамі беларускага «трэцяга сектара» была вельмі важнай не толькі ў кантэксце маючых адбыцца 19 снежня выбараў прэзідэнта Беларусі, але і ў сувязі з тым, што хутка ў Берліне пройдзе Другі Форум грамадзянскай супольнасці «Усходняга партнёрства». «Грамадзянская супольнасць — лепшая платформа для развіцця і прасоўвання дэмакратыі», — адзначыў еўракамісар. Ён падкрэсліў, што Еўрасаюз вельмі хоча, каб прэзідэнцкія выбары ў Беларусі прайшлі празрыста і дэмакратычна. Паводле словаў Штэфана Фюле, ад таго, як пройдзе выбарчая кампанія ў цэлым, будзе залежаць далейшае супрацоўніцтва паміж ЕС і Беларуссю.

Еўракамісар акрэсліў шэсць пазіцый, на якія Еўрасаюз будзе звяртаць асаблівую ўвагу. Гэта рэгістрацыя кандыдатаў у прэзідэнты, склад выбарчых камісій, датэрміновае галасаванне, падлік галасоў, доступ да СМІ, а таксама свабода сходаў.

Калі пра збор подпісаў Штэфан Фюле выказаўся ў тым плане, што сёлета ўмовы для прэтэндэнтаў на прэзідэнцкую пасаду былі значна больш спрыяльнымі параўнальна з мінулымі кампаніямі, то па іншых аспектах ёсць сур'ёзныя заўвагі. «Тое, што ў склад выбарчых камісій трапіла менш за адзін працэнт апазіцыянераў, вымушае задумацца», — сказаў Штэфан Фюле і падкрэсліў, што ў гэтым пытанні Еўропа чакала прагрэсу, чаго, аднак, не адбылося.

Апроч таго, Штэфан Фюле паведаміў, што ўжо ў лістападзе краіны Еўрапейскага саюза пачынаюць абмеркаванне сумеснага прамежкавага плана, што мусіць стаць часовым эрзацам двухбаковага пагаднення аб супрацоўніцтве паміж Беларуссю і ЕС, якое так і не было ратыфікавана. У снежні таксама мусіць пачацца абмеркаванне працэдуры рэадмісіі. Апроч таго, па словах еўракамісара, Еўрасаюз пачынае працэдуру спрашчэння для грамадзян Беларусі візавага рэжыму. «Спрашчэнне візавага рэжыму не будзе залежаць ад вынікаў прэзідэнцкіх выбараў», — паабяцаў Штэфан Фюле і заявіў, што надалей мае намер больш пільна сачыць за сітуацыяй у Беларусі, дзеля чаго плануе рэгулярна прыязджаць у нашу краіну.

ТРЭЦІ СЕКТАР

# ДЫЯЛОГ ЦІ ВЕРТЫКАЛІЗАЦЫЯ

Алена ВАРАЖБЕЙ

**Нацыянальная канферэнцыя па наладжванні ўзаемадзеяння паміж дзяржавай і грамадзянскай супольнасцю атрымала гучны розгалас. Замест чаканых 120 удзельнікаў на яе сабралася ў два разы больш.**

## Па платформах

Канферэнцыя праходзіла ў межах праекту АБСЕ «Развіццё патэнцыялу для ўзаемадзеяння грамадскіх і дзяржаўных арганізацый у Рэспубліцы Беларусь». Яе падрыхтоўкай займаўся кіраўнік «Цэнтра СКАФ» Юрый Загумённаў, які з'яўляецца сябрам Грамадска-кансультатыўнай рады (ГКР) пры Адміністрацыі прэзідэнта. Адной з галоўных задач мерапрыемства ставілася ініцыяваць стварэнне дыялогавых пляцовак (платформ) па розных сферах дзейнасці. Прапановы іх удзельнікаў, як было заяўлена, мяркуецца перадаваць у ГКР і грамадскія рады пры міністэрствах і ведамствах. А яны ўжо, па задуме, будуць дамагацца ад дзяржаўных органаў рашэння праблем.

Да абмеркавання былі прапанаваны накірункі — бізнес, культура, адукацыя, сацыяльная абарона, жаночы рух і гендэрная роўнасць, межканфесійны дыялог, міжнародное супрацоўніцтва ды іншыя. Кіраўнік «Канфедэрацыі прадпрымальніцтва», сябра ГКР Уладзімір Карагін распавёў пра працу 17 дыялогавых пляцовак. Іх мадэратары агучылі тое, якія праблемы трэба вырашыць на дзяржаўным узроўні ў гэтых сферах, а таксама якім павінен быць дыялог улады і грамадскасці. Было паведамлена, што ўдзельнікі іх пляцовак збіраюцца час ад часу сустракацца. Калі плануецца наступнае агульнае мерапрыемства, нічога сказана не было. На гэтым канферэнцыя скончылася.

Прысутныя паставіліся да яе неадназначна. Прагучалі і рэзкія заявы пра спробу маніпуляцыі грамадскімі арганізацыямі і імітацыю дыялогу. А ідэю «платфармізацыі» яе працаўнікі расцанілі як спробу «вертыкалізацыі грамадзянскай супольнасці на вобраз і падабенства Адміністрацыі прэзідэнта». Менавіта яна, на іх думку, выступае рэальным заказчыкам «будаўніцтва бутафорскіх платформ».

«Каб кансалідавацца, спачатку трэба раз'яднацца і вызначыцца самім», — заявіў апанентам у заключным слове Юрый Загумённаў. Наступныя сустрэчы, як ён лічыць, неабходна праводзіць без «апазіцыі».

## За шырмай

Вялікая колькасць грамадскіх арганізацый нічога не ведала, што такая канферэнцыя рыхтуецца. Прычым вельмі спешна, як паведаміла кіраўнік «Цэнтра прававой трансфармацыі» Алена Танкачова. У прыватнасці, на яе думку, гэта звязана з прыездам у Беларусь еўракамісара Штэфана Фюле. А наогул, уладзе хочацца прадэманстраваць поспехі ў лібералізацыі і дэмакратызацыі высокім прадстаўнікам ЕС, якія зачасцілі ў Беларусь напярэдадні выбараў.

«Мы ўжо бачым вялікую колькасць прэтэнзій з боку незалежных арганізацый адносна парадку фармавання выбарчых камісій. Зразумела, там ужо сказаць, што ў нас ёсць сур'ёзныя якасныя змяненні, дзяржаве будзе цяжка», — зазначыла Алена Танкачова. Таму, на яе погляд, было вырашана прадэманстраваць пазітыўныя зрухі ў наладжванні дыялогу з грамадзянскай супольнасцю. «Але мы не гатовыя гаварыць пра нейкія змяненні ў адносінах паміж дзяржавай і грамадзянскім сектарам. Таму што такога змянення фактычна не адбылося», — сказала яна.

Тым не менш, як адзначае прадстаўнік «Цэнтра еўрапейскай трансфармацыі» Андрэй Ягораў, многія арганізацыі ўключаюцца ў працэс стварэння платформ, бо спадзяюцца на ўзаемадзеянне і дыялог з уладай. Пераважна гэта культурніцкія і сацыяльныя арганізацыі. Да таго ж, як паказала канферэнцыя, і бізнесмены. Прадстаўнікі грамадскасці, якія кансалідаваны вакол Нацыянальнай платформы грамадзянскай супольнасці «Усходняга партнёрства», інакш расцэньваюць фарсіраванае будаўніцтва дыялогавых пляцовак. З іх пункту гледжання, гэта, па-першае, не інакш як маніпуляцыя і сімуляцыя. А па-другое — спроба выціснуць «рэальныя арганізацыі» грамадзянскай супольнасці з працэсаў еўрапейска-беларускага супрацоўніцтва. Беларуская ўлады імкнуцца скарэктаваць склад прадстаўніцтва грамадзянскай супольнасці на форуме «Усходняга партнёрства». І ўключыць туды сябраў Грамадска-кансультатыўнай рады пры Адміністрацыі прэзідэнта.

**«Каб кансалідавацца, спачатку трэба раз'яднацца і вызначыцца самім», — заявіў апанентам у заключным слове Юрый Загумённаў. Наступныя сустрэчы, як ён лічыць, неабходна праводзіць без «апазіцыі»**



Юрый Загумённаў

Праблема ў тым, падкрэсліваюць прадстаўнікі трэцяга сектару, што ўладзе патрэбны не сам дыялог, а толькі яго бачнасць. «Але мы не будзем задавальвацца роляй, калі мы папросту вяшчаем у пустату пра беды і праблемы, — падкрэсліла Алена Танкачова. — Мы хочам быць упэўнены ў тым, што да нашага голасу прыслухоўваюцца. Мы хочам быць упэўнены ў тым, што механізм рэалізацыі нашых прапаноў ёсць. І дзяржава прымае на сябе адказнасць за тое, каб наша думка і наш голас былі ўлічаны і рэалізаваны. І наша задача — не даць імітаваць гэты працэс. І выступіць у ім канструктыўным партнёрам».

## Перспектывы

Дыялогу паміж дзяржавай і грамадзянскай супольнасцю на сёння няма. Гэту дамінуючую думку ўдзельнікаў групы, якая абмяркоўвала на канферэнцыі «грамадска-дзяржаўны дыялог», агучыў Улад Вялічка, каардынатар нацыянальнай платформы «Усходняга партнёрства».

«І нават прысутнасць у нашай інфармацыйнай прасторы тых грамадска-кансультатыўных радаў, якія ёсць альбо пры міністэрствах, альбо пры Адміністрацыі прэзідэнта, гэта хутчэй форма высвятлення пазіцый ці кансультавання дзяржавы, чым форма рэальнага дыялогу паміж дзяржавай і грамадзянскай супольнасцю», — зазначыў ён.

На яго погляд, намеры і матывацыя дзяржавы ў дыялогу пакуль не дастаткова відавочныя. З боку ўлады неабходны крокі, якія б рэальна сведчылі пра зацікаўленасць думкай грамадзянскай супольнасці. Бо практыкуюцца рэпрэсіўныя меры ў выглядзе крымінальнага артыкула 193.1 (дзейнасць ад імя незарэгістраванай арганізацыі), нерэгістрацыі арганізацый ці праектаў і іншае. «Многае з гэтага вырашаецца дастаткова простымі адміністратыўнымі механізмамі», — сказаў Улад Вялічка. Захады па лібералізацыі грамадскага сектару, адзначыў ён, маглі б прадэманстраваць гатоўнасць дзяржавы да вядзення дыялогу.

«Я, з аднаго боку, не вельмі веру, што дыялог у сённяшніх абставінах можа хутка развівацца, — мяркуе ён. — А з другога боку, я не бачу ніякіх альтэрнатыў, як можна яго далей ігнараваць.Таму мне здаецца, што ён непазбежна будзе развівацца, але са значна меншай хуткасцю, чым нам усім гэтага б хацелася».

ПРЫВАТЫЗАЦЫЯ

# ДЗЯЛЬБА КАБАНЧЫКА

Вольга ХВОІН

**Урад Беларусь плануе да 2013 года завяршыць акцыянаванне ўсіх дзяржаўных прадпрыемстваў. Паводле плану прыватызацыі, на працягу трох наступных гадоў будзе акцыянавана больш за 500 прадпрыемстваў. Але ці будзе гэта адкрыты і роўны доступ да дзяржаўнага здабытку, ці неразмеркаванне рэсурсу паміж набліжанымі да ўладаў людзьмі?**

Прыватызацыйныя працэсы ў Беларусі падтрымліваюць Міжнародны валютны фонд і Сусветны банк, з якімі цесна супрацоўнічае апошнія гады ўрад, яны лічаць прыватызацыю адной з ключавых і патрэбных Беларусі структурных рэформаў. Сусветны банк гатовы дапамагчы ўраду з аплатай паслуг кансультантаў, якія працуюць у сферы прыватызацыі.

Сёлета плануецца завяршыць акцыянаванне трох буйных беларускіх прадпрыемстваў — «Беларуськалій», прадпрыемства па транспарціроўцы нафтапрадуктаў «Гомельтранснефть» і Наваполацкі нафтаправод «Дружба». Ужо прайшлі працэдуру акцыянавання такія буйныя прадпрыемствы краіны, як БелАЗ, МАЗ, «Інтэграл». Завяршаецца працэс акцыянавання станкабудаўнічых прадпрыемстваў, у межах гэтага працэсу плануецца стварыць станкабудаўнічы холдынг. Ёсць намеры цягам 2011–2013 гадоў акцыянаваць увесь машынабудаўнічы комплекс краіны, акрамя трактарнага і сельскагаспадарчага. У спіс прадпрыемстваў, што падпадаюць пад планы прыватызацыі ў 2011–2013 гадах, не ўваходзяць прадпрыемствы энергетыкі і газазабеспячэння, бо яны складаюць энергетычную бяспеку краіны.

Раней першы віцэ-прэм'ер Уладзімір Сямашка заяўляў, што акцыянерамі нафтаперапрацоўчых заводаў краіны могуць стаць венесуэльскія кампаніі. «Венесуэла, як і іншыя краіны, можа прэтэндаваць і быць акцыянерам нафтаперапрацоўчых заводаў Беларусі. Усё залежыць ад таго, якія ўмовы прапануе фундатар, — патлумачыў чыноўнік. — Галоўная наша ўмова для стратэгічнага фундатара — партнёр павінен мець унутраныя рэсурсы. Расія сёння мае ўласныя рэсурсы нафты, але іх мае і Венесуэла, і яна таксама можа прэтэндаваць на тое, каб стаць стратэгічным фундатарам. У залежнасці ад умоў, можа быць прададзены і кантрольны пакет. А чаму б і не?» У ліку патрабаванняў да фундатараў — наяўнасць уласных рынкаў збыту прадукцыі, інвестыцыйная праграма як мінімум на 10 гадоў.

Немалы рынак прывабных для замежнага капіталу прадпрыемстваў прымусіў загаварыць пра верагоднасць рэйдэрства. Калі на чале дзяржавы застанецца цяперашняе кіраўніцтва, і планаў сваіх яно не зменіць, то ў наступным годзе ў краіне чакаецца адмена мараторыя на рух акцый. Эксперты адзначаюць праблему інвестыцыйнай культуры мясцовых уласнікаў, якія кепска ведаюць мясцовае заканадаўства і ўласныя правы, што ставарае спрыяльныя ўмовы для паглынання капіталу і рэсурсаў замежнымі буйнымі кампаніямі супраць волі іх уласнікаў і кіраўнікоў. У сувязі з гэтым урад ужо пачаў распрацоўваць нарматыўна-прававыя акты па процідзеянні рэйдэрству.

«Мы ведаем пра рэйдэрства па іншых краінах, напрыклад, па досведзе Расіі. Хоць праца ў рэспубліцы ў гэтым кірунку, у частцы падрыхтоўкі нарматыўных актаў, распрацоўкі падыходаў, вядзецца адпаведнымі органамі», — паведаміў намеснік міністра эканомікі Беларусі Алег Мельнікаў. Чыноўнік зазначыў, што дакумент прадугледжвае ўзмацненне абароны інтарэсаў інвестараў і будзе спрыяць паляпшэнню інвестыцыйнага клімату ў краіне, падвышэнню міжнароднага рэйтынгу.

Аляксандр Лукашэнка тым часам запэўніваў у празрыстасці прыватызацыйных працэсаў. «Што тычыцца наменклатурнай прыватызацыі, яе ў Беларусі няма, хоць прыватызацыя ідзе. Можа, не такімі тэмпамі, як камусьці хацелася б, але яна ідзе. І наменклатурнай прыватызацыі ніколі не будзе, — запэўніў кіраўнік дзяржавы. — Калі хтосьці з нашых грамадзян прапануе за пакеты акцый кошт большы, ён будзе акцыянерам. Калі гэта будзе немец, значыць, будзе ён. Умовы вызначаныя. І не важна, хто ты: рускі, беларус або немец, — грошы на стол — і атрымлівай пакет акцый пры вызначаных умовах».



Дзяліць дзяржаўную ўласнасць, праводзіць прыватызацыю трэба толькі тады, калі ў рэгіёне звыш 50% прадукцыі вырабляе прыватны бізнэс. Значыць трэба стварыць магчымасці для развіцця прыватнага бізнэсу

Натуральна, што за акцыі буйных і прывабных беларускіх прадпрыемстваў плацяць не беларусы з дуляй у кішэні, а буйныя бізнесмены, у тым ліку і з Расіі. Напрыклад, «Лукойл-Беларусь», што зарэгістраваны на нямецкае даччынае прадпрыемства канцэрна «Лукойл Інтэрнэшнл Гмбх» з'яўляецца буйнейшым прыватным пастаўшчыком і перапрацоўнікам нафты на беларускіх НПЗ і экспарцёрам нафтапрадуктаў праз беларускую мяжу. А 49% акцый СТАА «Мабільныя Тэлесістэмы» належыць расійскаму ААТ «МТС», рэшта акцый кантралюецца дзяржавай. ЗАТ «Беларуская калійная кампанія» аб'ядноўвае збыт «Уралкалия» і «Беларуськалія», расіяне валодаюць паловай устаўнога фонду. Цяпер ідуць перамовы наконт набыцця Кітаем пакета акцый ААТ «Беларуськалій».

Аляксандр Лукашэнка зазначыў, што ў Беларусі ў першую чаргу прыцягваюцца інвестары да прыватызацыі нізкарэнтабельных прадпрыемстваў, часам стратных, але якія маюць перспектыву развіцця ў беларускай дзяржаве. Дзейнасць інвестараў на падобных прадпрыемствах будзе падтрымлівацца, яны атрымаюць прэферэнцыі.

Незалежныя эканамісты аптымізму дзяржаўных мужоў не падтрымліваюць і перасцерагаюць пра ценявую прыватызацыю. Так, кіраўнік аналітычнага цэнтра «Стратэгія» Леанід Заіка гаворыць, што беларускай прыватызацыі на дадзены момант не хапае грамадскага кантролю, да таго ж неўпарадкаваны падыход да продажу буйных прадпрыемстваў вынішчыць і без таго кволы дробны бізнэс.

«Дзяліць дзяржаўную ўласнасць, праводзіць прыватызацыю трэба толькі тады, калі ў рэгіёне звыш 50% прадукцыі вырабляе прыватны бізнэс. Гэта значыць, спачатку трэба стварыць магчымасці для развіцця прыватнага бізнэсу, і калі ён стане на ногі, тады праводзіць прыватызацыю, — гаворыць эксперт. — Кітайцы таксама не сталі праводзіць прыватызацыю, пакуль не падрос іх уласны малы і сярэдні бізнэс, уласны капітал. І цяпер там малы і сярэдні бізнэс развітыя добра. А ў нас ён як пасля поліяміэліту — ножкі крывенькія, сам слабенькі».

Наконт доступу грамадзян да дзяржаўнай маёмасці, Заіка задае рытарычнае пытанне: «Вы мелі магчымасць паўдзельнічаць у прыватызацыі нейкіх прадпрыемстваў?» Ярраслаў Раманчук, які цяпер балатуецца ў прэзідэнты, настойвае на тым, што эканамічны пад'ём без сістэмных зменаў у дзяржаве немагчымы, і праграмы, пра якія гаворыць урад, збольшага выглядаюць фармальнымі, бо найперш яны не забяспечваюць роўны, празрысты працэс продажу актываў прадпрыемстваў.

ЛІЧБЫ

# ГАНДАЛЬ ПАДРАСТАЕ

**Афіцыйная статыстыка канстатуе скарачэнне адмоўнага сальда ў 1,5 разы за 9 месяцаў бягучага года ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года.**

На пазітыўны зрух паўплываў рост аб'єму паставак на знешні рынак тэхнікі беларускай вытворчасці, машын, абсталявання.

Экспарт і імпарт інвестыцыйных тавараў у студзені-верасні бягучага года быў прыкладна роўным і здзяйсняўся практычна ў роўных аб'ёмах. Імпарт інвестыцыйных тавараў перавысіў іх экспарт усяго на 0,1 мільярда долараў. Адпаведна, імпарт склаў 2,1 мільярда долараў, а экспарт — 2 мільярда.



Разам з тым у бягучым годзе скараціўся ў 1,7 разы імпарт нафты з Расіі. Аб'ёмы паставак нафты ўпалі з 16,2 мільёна тон за дзевяць месяцаў у 2009 годзе да 9,4 мільёна тон. Намесніца старшыні Нацыянальнага статыстычнага камітэта Беларусі Ірына Кангро паведаміла, што за дзевяць месяцаў 2010 года амаль у чатыры разы скараціўся імпарт нафтапрадуктаў з Расіі — з 2,7 да 0,7 мільёна тон. Спецыяліст зазначыла, што павысіўся экспарт у Расію трактароў (рост на 22,7%), грузавых аўтамабіляў (рост у 3,5 разы), малака і малочных прадуктаў (рост на 31,2%). Найбольшыя аб'ёмы экспарту ў Беларусі з Расіяй — 40%, краінамі Еўрасаюзу — 28,5%, іншымі краінамі СНД — 15%. Па імпарту Расія таксама ў лідэрах — 52,8% ад агульнага аб'ёму імпарту, на Еўрасаюз прыпадае 21,3% імпарту.

Цягам дзевяці месяцаў палепшылася сітуацыя са знешнім гандлем з шэрагам іншых краін. Па звестках Нацыянальнага статыстычнага камітэта, у цэлым аб'ём знешняга гандлю таварамі за гэты перыяд павялічыўся ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года на 17,1% і склаў 41 мільярд 61,8 мільёна долараў. Пры гэтым экспарт павялічыўся на 16,8% і склаў 17 мільярдаў 539,6 мільёна долараў ЗША, імпарт — на 17,3% і склаў 23 мільярда 522,2 мільёна долараў. Сёлета істотна — на 9,9% — зменшыўся таваразварот з краінамі Еўрасаюза і склаў 9 мільярда 994,2 мільёна долараў. Імпарт вырас на 8,9%, а экспарт знізіўся на 23,2%. Адмоўнае сальда гандлёвага балансу склала 5,5 мільёна долараў.

Перакос знешнегандлёвага балансу ў мінус назіраецца цягам апошніх гадоў, у перыяд эканамічнага крызісу сітуацыя яшчэ больш пагоршылася, але ўрад Беларусі не губляе надзеі выправіцца. Так, начальнік галоўнага ўпраўлення макраэканамічнага аналізу і прагназавання Мінэканомікі Аляксандр Ярашэнка паведаміў, што ў праект Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця на наступныя пяць гадоў унесеная задача па выхадзе на дадатнае сальда знешняга гандлю ў 2015 годзе. Чыноўнік не адмаўляецца ад таго, што зрабіць гэта будзе няпроста. «Задача вельмі складаная ва ўмовах росту коштаў на энергетычныя рэсурсы», — зазначыў Аляксандр Ярашэнка.

РОЗДУМ

# ФУТРА З ПАНСКАГА ПЛЯЧА

Канстанцін СКУРАТОВІЧ

**На самым высокім узроўні было сказана — грошай не шкадаваць. Маўляў, да гэтага часу краіна жыла коштам перапампоўвання вясковых рэсурсаў у гарады, а зараз надышоў час вяртаць запазычанасць.**

Што да ідэалогіі, то яна ў стасунках паміж дзяржавай і сялянамі застаецца нязменнай. Прыкладам, некалі іх заганялі ў калгасы, бо лічылася, што самі яны сваёй выгады не разумеюць. Ужо на нашай памяці, калі паўсюль на постсавецкай прасторы калгасы ляснулі, беларускім калгаснікам шлях у фермеры перакрылі. Спужаліся, што тыя фермеры краіну не накормяць. Хоць на самай справе ніводзін фермер ні паасобку, ні ўсе яны разам нікога накарміць не абяцалі. Большасць з іх хацела толькі аднаго — вольна працаваць на ўласнай зямлі і мець ад гэтага адпаведныя набыткі.

Высноўа напрошваецца адна: як і раней, кіраўніцтва краіны лічыць вяскоўцаў не здатнымі да асэнсаванага выбару ні ў гаспадарніцтве, ні ў сацыяльнай сферы. Так ставіцца або да дзяцей, катэгарычна забараняючы ім карыстацца запалкамі, або хворых на маразм старых. Сярэдняга веку (акмэ, як казалі старажытныя грэкі) у сялян быццам бы і не бывае.

Цікава, што ні да каго іншага такія патрабаванне забяспечыць народ сваімі таварамі або паслугамі не ставяцца. Таму прамысловасць, будаўніцтва, транспарт ды іншыя галіны народнай гаспадаркі працуюць, як умеюць, і робяць, што хочуць. Прыкладам, з самага пачатку 1990-х гадоў цэны на прамысловую прадукцыю і паслугі былі фактычна свабодныя, а цэны на харчаванне паставілі пад жорсткі кантроль. Такім чынам улады імкнуліся пазбегнуць сацыяльнага выбуху ў сталіцы і абласных цэнтрах. Кошты на прадуктовыя тавары ўстанаўліваліся на ўзроўні заробкаў рабочых і служачых, а вяскоўцам плацілі ў адпаведнасці з тым, колькі яны ў такіх умовах «заробяць». А часцяком і тое не плацілі. Бывала, што да канца года запазычанасць па заработнай плаце ў сельскай гаспадарцы складала 6 і болей месячных фондаў аплаты працы.

Падкрэслім, ніхто ніколі не браў на сябе абавязацельствы забяспечыць сялян таннымі аўтамабілямі, лядоўнямі, тэлевізарамі, пральнымі машынамі ды іншым дабром па суразмерных з калгаснымі здабыткамі коштах. Што даюць, тое і добра.

Гэта ўсё называлася захаваннем дзяржаўнага рэгулявання эканомікі. Прасцей — пераразмеркаваннем сродкаў ад абсалютнай беднаты на карысць большасці адносна бедных, але лепш арганізаваных. Цікава, што і пазней, калі быццам бы сельская гаспадарка раней за ўсіх аднавіла памеры вытворчасці на ўзроўні 1990 года, заробкі ў галіне складалі каля 60% ад сярэдняга па народнай гаспадарцы ўзроўню. Увогуле, як бы ні ладзіліся справы ў краіне і калгасах, добра або дрэнна, лёс селяніна адзін — быць бедным.

Калі кажуць, што калгасы працуюць неэфектыўна, мусіць, кажуць праўду. Але не ўсю. Поўная праўда нашмат больш балючая і крыўдная. Бо на самай справе больш-менш эфектыўна ў нас працуюць хіба што некалькі прадпрыемстваў кшталту Салігорскага калійнага камбіната, Жлобінскага металургічнага завода ды палескіх нафтаздабытчыкаў. Было б інакш — у бюджэце


Photo.ByMedia.Net

былі б грошы, каб, з аднаго боку, забяспечыць краіну дастатковым, якасным і танным харчаваннем, а з другога — ажыццявіць сапраўдную лібералізацыю сельскай гаспадаркі. Хай бы сяляне адчулі свабоду працы на сябе і звязаную з ёй адказнасць за яе вынікі.

Пакуль жа, як здаецца, няма ў краіне асобы або ўстановы, якая б не апекавалася сельскай гаспадаркай, не дапамагала б сялянам збіраць ураджай, сеяць, веяць, садзіць або даіць. Па-ранейшаму лічыцца, што яны да гэтага няздольныя. Прынамсі, на думку сённяшніх кіраўнікоў, большасць якіх — гэта дзеці ды ўнукі калгаснікаў, а яны вельмі блізкія па менталітэце да сваіх бацькоў і дзядоў, але з той розніцай, што ўжо саромеюцца адсутнасці ў хаце цёплай прыбіральні. Калі самі раслі, дык ніякага дыскамфорту не заўважалі, а пажыўшы ў студэнцкіх інтэрнатах, сталі круціць носам. А калі ўжо павыбіваліся ў людзі, дык адчулі сябе ніякавата.

Дык вось вам футра з панскага пляча...

Карацей, калі пагадзіцца з Горкім, які сцвярджаў, што рэлігія ёсць «вздох угнетенной твари», то ідэя стварэння аграгарадкоў «з усімі выгодамі» ёсць формай падзякі вёсцы ад яе лепшых сыноў, пазбаўленых у дзяцінстве цёплай прыбіральні.

Магчыма, гучыць крыху вульгарна, але кропля «мужыцкай праўды» ў гэтым ёсць. Бо былыя даўгі сялянам сплачваюць так, каб да іх не трапіла ніводнай жывой капейчыны. І дамкі, і аграгарадкі, і ўвесь сацкультбыт робяць за грошы гарадскія праекціроўшчыкі, будуюць гарадскія будаўнікі, вызначаюць мінімальныя сацыяльныя стандарты гарадскія спецыялісты. Усе яны некалі збеглі з вёсак і нават у аграгарадкі вяртацца не збіраюцца.

Памятаю, як на адной нарадзе з удзелам высокіх агракіраўнікоў выступоўца-фермер даводзіў, што гэтыя грошы трэба аддаваць непасрэдна сялянам. Тым, хто хоча жыць і працаваць у сельскай мясцовасці. Хай бы яны самі выбралі і месца для сядзібы, і архітэктуру яе, і памер і прызначэнне гаспадарчых пабудоў. Дзяржаве б не давялося рупіцца пра вяртанне крэдытаў. Прыватнікі ў нашай краіне — самыя акуратныя плацельшчыкі, бо адказваюць па абавязацельствах усім нажытым дабром.

А дзяржаве б заставалася забяспечыць інфраструктуру, звязаць новыя паселішчы ў адно цэлае, што без асаблівага клопату дазваляюць рабіць сучасныя тэхналогіі.

Не, дзяржава агульныя нашы грошы па-ранейшаму выкарыстоўвае так, як гэта выгадна чыноўнікам. Мы не кажам, што яны іх крадуць (хоць, верагодна, і без гэтага не бывае нідзе і ніколі), але распараджэнне гэтымі рэсурсамі забяспечвае іх уладай як асноўным сродкам існавання.

Вяскоўцы ж дэманстратыўна пляскаюць ад задавальнення ў далоні, але жыць у персанальным раі не жадаюць. Пра гэта сведчаць дадезныя апошняга перапісу. Як паведаміла капыльская газета «Слава працы», за 10 год колькасць насельніцтва ў раёне скарацілася (!) на 9,7 тысяч чалавек (на 22,7%). Для параўнання, за дзесяцігоддзе паміж перапісамі 1989 і 1999 гадоў змяшэнне склала 3 тысячы (6,7% ад агульнай колькасці). Насельніцтва самога Капыля з часу папярэдняга перапісу паменшылася на 900 чалавек. За перыяд паміж апошнімі перапісамі колькасць дзяцей ва ўзросце 10–14 гадоў паменшылася ў 1,8 разу.

Адзначым, што Капыль — гэта не якісьці там аграгарадок, а былая цэнтральная сядзіба калгаса «Памяці Варашылава». Гэта адзін з самых прывабных і знакамітых беларускіх гарадоў. Але і яго насельніцтва ў існых умовах пачынае вымiраць, і з кожным годам усё хутчэй. Такая ж сітуацыя і ва ўсіх астатніх раённых (і не толькі) цэнтрах. Калі людзі не хочуць жыць у прыстойных гарадах, дык хто ж памкнецца ў тыя агрaгарадкі?

Падводзім вынікі. Нараджаць няма каму, працаваць няма каму, хутка не будзе каму жыць. А будаўніцтва працягваецца.

ПРЭС-КАНФЕРЭНЦЫЯ

# ПЕРСПЕКТЫВЫ ВЫБАРАЎ

Аляксей ХАДЫКА

**15 лістапада адбылася прэсавая канферэнцыя місіі назіральнікаў АБСЕ на прэзідэнцкіх выбарах 19 снежня ў Беларусі. Першая і апошняя перад наступнай выніковай прэс-канферэнцыяй, якая чакае нас ужо пасля выбараў. Таму невялікая колькасць журналістаў у зале — 15–20 чалавек — выклікала шчырае здзіўленне.**




Размова пачалася з прадстаўлення кіраўнікоў місіі (апрача яе кіраўніка амбасадара Герта Арэнса прысутнічалі яшчэ чатыры чалавекі). Місія будзе складацца з 40 доўгатэрміновых назіральнікаў і 400 кароткатэрміновых. Спадар Арэнс працаваў з падобнай місіяй у нашай краіне і раней — на выбарах у 2006 і 2008 гадах.

Пытанні журналістаў на прэсавай канферэнцыі распачаў нейкі расійскі госць. Ён прыгадаў пра выпадак, калі на адзін выбарчы ўчастак у яго краіне завіталася сапраўдная тыгрыца, і пацікавіўся ў амбасадара Арэнса, ці не здаралася ў ягонай практыцы назірання за выбарамі ў Беларусі падобнай весялухі. Цяжка сказаць, ці быў расійскі калега цвярозы, але Герт Арэнс цалкам цвяроза адказаў яму, што збольшага весялуха на выбарах яго не цікавіць.

Наступнае пытанне тычылася адной гіпотэзы, якая зараз вітае ў паветры. Згодна з ёй, нядаўні візіт міністраў замежных спраў Польшчы і Германіі быў звязаны з пэўнай палітычнай прапановай, якую тыя зрабілі беларускаму кіраўніку. І быццам бы, паслухаць яго адказ прыязджаў напачатку гэтага тыдня еўрапейскі камісар па пытаннях пашырэння ЕС і еўрапейскай палітыцы суседства Штэфан Фюле.

Сутнасць ідэі ў тым, што Лукашэнку разам з трохмільярдным крэдытам прапаноўваюць зноў «выйгачана выйграць» бліжэйшыя выбары. Але да наступных парламенцкіх выбараў 2012 года, года, калі давядзецца плаціць асноўныя працэнты па набраных крэдытах (працэнты, якія Еўропа можа і панізіць) — правесці канстытуцыйную рэформу. Беларусь зробіцца парламенцкай рэспублікай, выбары 2012 года пройдуць карэктна і празрыста, а Лукашэнка стане кімсьці кшталту «англійскай каралевы» — з усімі гарантыямі недатыкальнасці. Адным словам, пытанне зводзілася да наступнага: ці не пераўтвараецца ў такім выпадку місія назіральнікаў АБСЕ ў чыста тэхнічны акт. Адказ быў досыць кароткі і цікавы: спадар Арэнс заявіў... што АБСЕ ў палітыку не ўмешваецца.

Спадар Арэнс пачаў разважаць пра тое, што спецыялісты АБСЕ падрыхтавалі для беларускіх заканадаўцаў цэлы пакет па рэформе выбарчага права, і што многія прапановы Еўропы прымаюцца. І атрымаў пытанне: ці задавальняе яго хуткасць заканадаўчага прыняцця беларусамі еўрапейскіх парад? І зноў прагучаў завуаляваны адказ. Маўляў, глядзіце зробленыя на гэты конт сумесныя высновы аўтарства АБСЕ і Венецыянскай камісіі. Чытай: відавочна, не вельмі задавальняюць. Але спадар Арэнс стойка трымаўся ветлівага тону мовы дыпламатыі.

Якія абсалютна ясныя высновы можна зрабіць з трансляванай нам інфармацыі? Відавочна, нас чакаюць чарговыя «скрадзеныя выбары». Таму аптымістам варта да гэтага рыхтавацца, каб не перажываць рэзкую дэпрэсію. Аднак збіццё дэманстрантаў наўрад ці магчымае. Якая ж роля ў гэтай сітуацыі канкурэнтаў Лукашэнкі? Падаецца, становіцца актуальнай парада Зянона Пазняка: дзеля захавання маральнасці на гэтых выбарах неабходна здымацца з гонкі.

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ



## 24 ЛІСТАПАДА, СЕРАДА

### 1

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.05, 15.00, 17.00, 18.00, 23.15** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Сфера інтэрасаў.
**09.10** Дак. цыкл «Дзяржаўная палітыка».
**09.40** Меладрама «Маргоша» (Расія).
**10.30** Серыял «Спальны раён» (Расія).
**11.00** Серыял «Маруся» (Украіна).
**12.10** Меладрама «Падвойная згуба» (Расія).
**14.05** «Здароўе».
**14.30** «Альманах вандраванняў».
**15.20, 18.15** Навіны рэгіёна.
**15.40** Праграма «Праверка чутак».
**16.10** Серыял «Спальны раён» (Расія).
**16.50** Серыял «Маруся» (Украіна).
**18.25** Зямельнае пытанне.
**18.45** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**18.50** «КЕНО».
**19.00** Выбары-2010. Выступы кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь.
**20.00** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** Панарама.
**21.45** Дак. цыкл «Дзяржаўная палітыка».
**22.10** Серыял «Доктар Хаўс -5». 3-я серыя.
**23.30** Зона Х. Крымінальная хроніка.
**23.40** «Эпоха».
**00.10** Дзень спорту.
**00.20** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Агляд.
**01.30** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. «Інтэр»-»Твентэ».

### Н

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.20** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здарова!».
**10.10** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 23.35** Навіны спорту.
**11.10** Шматсерыйны фільм «Катоўскі».
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**21.05** «Гаражы».
**22.20** Асяроддзе пасялення.
**23.40** Спецдаследаванне.
**00.40** «Віёла Тараканава. У свеце злачыннага запалу». Шматсерыйны фільм.
**01.30** Начныя навіны.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Меч». Серыял.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Багатая і каханая». Тэленавэла.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Дарослыя гульні». Серыял.
**13.50** «Не хлусі мне!».
**14.40** «Студэнты 2». Серыял.
**15.30, 22.55** «Дурні, дарогі, грошы». Гумарыстычны серыял.
**16.50** «Новыя падарожжы дылетанта».
**17.20** «Мінгшчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Дарослыя гульні». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** «Меч». Серыял.
**21.25** «Пяць хвілін».
**21.30** «Мінск і мінчане».
**22.05** «Дабро пажаліцца».
**23.55** «Справа гонару». Серыял.
**00.45** «Баец». Серыял.

### ЛАД

**06.35** Маладзевы серыял «Універ» (Расія).
**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Дэтэктыўны серыял «Чыста англійскія забойствы» (Вялікабрытанія).
**09.05** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.10** Мюзікл «Ах, вадэвіль, вадэвіль…» (СССР).
**11.30** Спорт-кадр.
**11.55** «Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**12.45** «Запал па культуры».
**13.30** Медычныя таямніцы.
**14.00** Серыял «Пакахай мяне зноў».
**15.00** «Расшыфраваць дрэс-код». Дакументальна-пазнавальны цыкл (Францыя).
**15.30** Мультсерыял «Дракончык і яго сябры» (Канада).
**15.45** Пазакласная гадзіна.
**16.05** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**16.55** Серыял «Каханне як каханне» (Расія). Заключная серыя.
**18.00** Дэтэктыўны серыял «Чыста англійскія забойствы» (Вялікабрытанія).
**19.05** Мюзікл «Ах, вадэвіль, вадэвіль…» (СССР).
**20.25** «Калыханка».
**20.40** Тэлебарометр.
**20.45** Беларуская часіна.
**21.35** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Шальке - Ліён. Прамая трансляцыя.
**23.35** Рэальны свет.
**00.05** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**10.10** Прэм'ера. «Дыябет. Прысуд адмяняецца». Дакументальны фільм.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Праўда хавае хлусню».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «Сапраўднае жыццё».
**16.20** Тэлесерыял «Дворык».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.20** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Тэлесерыял «Чорная багіня». Расія.
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.30** Тэлесерыял «Праўда хавае хлусню».
**22.20** Тэлесерыял «Целаахоўнік».
**23.20** Навіны - Беларусь.
**23.30** «Весткі.ru».
**23.50** «Падзенне ўсёмагутнага міністра». Дакументальны фільм.

### НТВ

**06.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.30** Сёння.
**06.05** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** Футбол. Ліга Чэмпіёнаў УЕФА. Агляд.
**09.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.25** «Дачны адказ».
**11.20** «Развод па-руску».
**12.10** «Да суду».
**13.30** Дэтэктыўны серыял «Жыццё - поле для палявання».
**15.10** «Прафесія-рэпарцёр».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.30** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.20** Футбол. Ліга Чэмпіёнаў УЕФА. Рубін (Расія) - Капенгаген (Данія).
**21.25** Баявік «Псеўданім «Албанец»-3».
**00.00** Серыял «Ускосныя доказы».

### EUROSPORT

**09.30** Экстрэмальныя віды спорту. Freeride Spirit.
**09.45** Вось дык так!!!
**10.00** Зімовыя алімпійскія гульні. Ванкувер (Канада). Фінішная прамая. Часопіс.
**11.00, 12.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Летні Гран-пры. HS 134. Вісла (Польшча).
**13.00, 19.00, 23.45** Плаванне. Чэмпіянат Еўропы. Будапешт (Венгрыя). Дзень 12.
**14.30** Зімовыя алімпійскія гульні. Ванкувер (Канада). Фінішная прамая. Часопіс.
**15.30** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Часопіс.
**16.00, 17.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Летні Гран-пры. HS 131. Хакуба (Японія).
**18.00** Зімовыя алімпійскія гульні. Ванкувер (Канада). Фінішная прамая. Часопіс.
**20.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**20.10, 00.30** «Еўраспорт за чыстую планету». Часопіс.
**20.20** Абранае па серадах.
**20.30** Конны спорт. Кубак свету. Канкур. Штутгарт (Германія).
**21.30** Конны спорт. Турнір FEI Classics Series (Францыя).
**22.30** Навіны коннага спорту.
**22.35** Гольф. Адкрыты чэмпіянат Ганконга.
**23.05** Гольф клуб. Навіны гольфа.
**23.10** Яхт клуб. Навіны ветразевага спорту.
**23.30** «Спартовае вандраванне». Часопіс.
**23.40** «Спартовае вандраванне. Конны спорт». Часопіс.
**01.00** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе Турынг. Часопіс.
**01.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Летні Гран-пры. HS 140. Ліберац (Чэхія).

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** Праект «Будучыня».
**07.50** Асабісты капітал.
**08.05** Тыдзень з радыё «Свабода».
**08.35** ПраСвет.
**09.00** Рэпартэр.
**09.25** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**09.40** Хто ёсць кім?: Сяржук Вітушка.
**10.00** Вагон.
**10.05** «Бульбаны», мультсерыял.
**10.10** «Сонечная дзіда», серыял: 10 серыя.
**10.40** Перад выбарам.
**11.25** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Чорная княгіня Лізавета Астрожская».
**11.35** «Доктар Марцін», серыял: 12 серыя.
**12.25** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял: 12 серыя.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Сонечная дзіда», серыял: 11 серыя.
**17.35** «Доктар Марцін», серыял: 12 серыя.
**18.25** «Геніяльны аматар», дак. фільм, 2008 г., Румынія.
**19.10** Сальда (эканамічная праграма).
**19.30** Калыханка для самых маленькіх.
**19.40** На колах.
**20.10** «Мультклуб».
**20.15** Вагон (паўтор).
**20.20** Навігатар.
**20.40** Госць «Белсату».
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** Маю права (прававаая праграма).
**21.40** Эксперт.
**22.05** «Развітанне, вяртанне…», псіхалагічная драма, 1985 г., Францыя.
**00.00** Аб'ектыў.

## 25 ЛІСТАПАДА, ЧАЦВЕР

### 1

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 23.15** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**06.45** Nota Bene.
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 08.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Зямельнае пытанне.
**09.10** Дак. цыкл «Дзяржаўная палітыка».
**09.40** Меладрама «Маргоша» (Расія).
**10.30** Серыял «Спальны раён» (Расія).
**11.00** Серыял «Маруся» (Украіна).
**12.10** Прэм'ера. Камедыйная меладрама «Споведзь Дон Жуана» (Украіна).
**13.45** Відэафільм АТН «Дубровна-таямніцы сівога Дняпра « цыклу «Зямля беларуская».
**14.05** Дак. цыкл «У пошуках ісціны».
**15.20, 18.15** Навіны рэгіёна.
**15.40** Хранікальна-дакументальны цыкл «Гарачыя кропкі» (Беларусь).
**16.10** Серыял «Спальны раён» (Расія).
**16.50** Серыял «Маруся» (Украіна).
**18.25, 01.40** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**18.30** Сфера інтэрасаў.
**18.50** «КЕНО».
**19.00** Выбары-2010. Выступы кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь.
**20.00** Меладрама «Маргоша» (Расія).
**21.00** Панарама.
**21.45** Дак. цыкл «Дзяржаўная палітыка».
**22.10** Драматычны серыял «Доктар Хаўс -5» (ЗША). 4-я серыя.
**23.30** «Эпоха».
**00.00** Камедыя «Рататуй» (Расія).
**01.45** Дзень спорту.

### Н

**06.00, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здарова!».
**10.10** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** Шматсерыйны фільм «Катоўскі».
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Банды».
**22.20** «Тур дэ Франс».
**23.20** Нашы навіны.
**23.35** Навіны спорту.
**23.40** «Рускае поле Яна Фрэнкеля».
**00.40** «Віёла Тараканава. У свеце злачыннага запалу». Шматсерыйны фільм.
**01.30** Начныя навіны.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Мінгшчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Меч». Серыял.
**09.30** «Дабро пажаліцца».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Багатая і каханая». Тэленавэла.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Дарослыя гульні». Серыял.
**13.50** «Не хлусі мне!».
**14.40** «Студэнты 2». Серыял.
**15.30** «Дурні, дарогі, грошы». Гумарыстычны серыял.
**16.50** «Добры дзень, доктар!».
**17.20** «Мінгшчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Дарослыя гульні». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** «Меч». Серыял.
**21.25** «Пяць хвілін».
**21.30** «Праўда».
**22.05** «Аўтапанарама».
**22.55** «Дурні, дарогі, грошы». Гумарыстычны серыял.
**23.55** «Справа гонару». Серыял.
**00.45** «Баец». Серыял. Заключная серыя.

### ЛАД

**06.35** Маладзевы серыял «Універ» (Расія).
**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Дэтэктыўны серыял «Чыста англійскія забойствы» (Вялікабрытанія).
**09.10** Серыял «Каханне як каханне» (Расія). Заключная серыя.
**10.15** Дзіцячы прыгодніцкі фільм «Тапінамбуры» (СССР). 1-я серыя.
**11.35** Жансавет.
**12.15** «Бітва экстрасэнсаў».
**13.15** «Дача здароўя».
**13.50** Серыял «Пакахай мяне зноў».
**14.50** «Расшыфраваць дрэс-код». Дакументальна-пазнавальны цыкл (Францыя).
**15.20** Мультсерыял «Дракончык і яго сябры» (Канада).
**15.35** Пазакласная гадзіна.
**15.55** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**16.50** Дэтэктыўная меладрама «Чацвёртая група» (Украіна). 1-я серыя.
**17.55** Дэтэктыўны серыял «Чыста англійскія забойствы» (Вялікабрытанія).
**19.05** Містычная меладрама «Дзікае паляванне Караля Стаха». 1-я серыя.
**20.30** Калыханка.
**20.45** Тэлебарометр.
**20.50** Беларуская часіна.
**21.55** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**22.35** Маладзевы серыял «Універ» (Расія).
**23.10** Час футболу.
**23.40** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**10.10** «Нона Мардзюкова. Я успамінаю...». Дакументальны фільм.
**11.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Праўда хавае хлусню».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «Сапраўднае жыццё».
**16.20** Тэлесерыял «Дворык».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.20** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Тэлесерыял «Чорная багіня». Расія.
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.00** Весткі.
**20.30** Тэлесерыял «Праўда хавае хлусню».
**22.20** Тэлесерыял «Целаахоўнік».
**23.20** Навіны - Беларусь.
**23.30** «Весткі.ru».
**23.50** «Паядынак».

### НТВ

**06.00, 10.00, 13.00, 16.00** Сёння.
**06.05** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.40** Футбол. Ліга Чэмпіёнаў УЕФА. Агляд дня.
**09.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.25** «Следства вялі…».
**11.15** «Праспявана ў СССР».
**12.10** «Да суду».
**13.30** Серыял «Кодэкс гонару».
**15.10** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.30** Серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Крымінальны серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**21.40** Баявік «Псеўданім «Албанец»-3».
**23.40** Сёння.
**00.10** Серыял «Ускосныя доказы».

### EUROSPORT

**09.30** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе Турынг. Часопіс.
**10.00** Плаванне. Чэмпіянат Еўропы. Будапешт (Венгрыя). Дзень 12.
**11.00, 12.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Летні Гран-пры. HS 131. Хакуба (Японія).
**13.00** Зімовыя алімпійскія гульні. Ванкувер (Канада). Фінішная прамая. Часопіс.
**14.00** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Часопіс.
**14.30** Плаванне. Чэмпіянат Еўропы. Будапешт (Венгрыя). Дзень 12.
**16.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Летні Гран-пры. HS 140. Ліберац (Чэхія).
**17.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Летні Гран-пры. HS 140. Клігенталь (Германія).
**18.00** Плаванне. Чэмпіянат Еўропы на кароткай вадзе. (Нідэрланды). Дзень 1.
**20.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**20.10** Боўлінг. PBA тур. ЗША. Часопіс.
**21.00** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб. Чэмпіянат Hype Fight. Германія.
**00.05** Вось дык так!!!
**00.10** Пра рэстлінг. Агляд WWE.
**00.40** Пра рэстлінг. Vintage Collection. ЗША.
**01.45** Скачкі на лыжах з трампліна. Летні Гран-пры. HS 140. Клігенталь (Германія).

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** На колах.
**07.50** Маю права (юрыдычная праграма).
**08.10** Госць «Белсату».
**08.25** Эксперт.
**08.45** «Геніяльны аматар», дак. фільм, 2008 г., Румынія.
**09.30** Вагон.
**09.40** Навігатар.
**10.00** Сальда (эканамічная праграма).
**10.15** «Сонечная дзіда», серыял.
**10.40** «Мультклуб».
**10.45** Доктар Марцін», серыял: 12 серыя.
**11.35** Развітанне, вяртанне…», псіхалагічная драма, 1985 г., Францыя.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Зорны пірат», серыял: 7 серыя.
**17.35** Развітанне, вяртанне…», псіхалагічная драма, 1985 г., Францыя.
**19.35** Калыханка для самых маленькіх.
**19.45** Праект «Будучыня».
**20.15** Басанож па свеце: «Шчасныя выспы».
**20.40** Беларусы ў Польшчы.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** Рэпартэр.
**21.50** «Загадкі Мэрдака», дэтэктыўны серыял: ч. 3, 8 серыя.
**22.40** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Загуж. Апошні прыпынак», дак. фільм, 2009 г., Польшча–Расія.
**23.00** Аб'ектыў.

## 26 ЛІСТАПАДА, ПЯТНІЦА

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 00.05** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Сфера інтэрасаў.
**09.10** Дак. цыкл «Дзяржаўная палітыка».
**09.40** Меладрама «Маргоша» (Расія).
**10.30** Серыял «Спальны раён» (Расія).
**11.00** Срыял «Маруся» (Украіна).
**12.10** Прэм'ера. Меладрама «Слон і Моська» (Расія).
**13.45** Адмысловы рэпартаж АТН «Мама. Не роля, а лёс».
**14.05** «Школа доктара Камароўскага». Ток-шоў (Украіна).
**14.30** Кулінарнае шоў «Кухар дома» (ЗША).
**15.20, 18.15** Навіны рэгіёна.
**15.45** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
**16.50** Серыял «Маруся» (Украіна).
**18.30** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**18.50** «КЕНО».
**19.00** Выбары-2010. Выступы кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь.
**20.00** Меладрама «Маргоша» (Расія).
**21.00** Панарама.
**21.45** Дак. цыкл «Дзяржаўная палітыка».
**22.10** Камедыя «Урокі спакушэння» (ЗША).
**00.20** «Эпоха».
**00.50** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).
**01.35** Дзень спорту.

**06.00, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здарова!».
**10.10** «Мая жонка мяне пычаравала». Шматсерыйны фільм.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** Шматсерыйны фільм «Катоўскі».
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Чакай мяне». Беларусь.
**18.55** «Поле цудаў».
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** АНТ прадстаўляе: «Што? Дзе? Калі? у Беларусі». Зімовая серыя гульняў.
**22.30** АНТ прадстаўляе: «Музычны суд».
**23.40** «Наша Беларашa».
**00.15** Прэм'ера. Фільм «Баксы».
**02.45** Начныя навіны.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Меч». Серыял.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Багатая і каханая». Тэленавэла.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Дарослыя гульні». Серыял.
**13.50** «Не хлусі мне!».
**14.40** «Студэнты 2». Серыял.
**15.30** «Дурні, дарогі, грошы». Гумарыстычны серыял.
**16.50** «Ля парараднага пад'езду».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** Ток-шоў «Лёс».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** «КВЗ. Першая ліга. 1/2 фіналу».
**22.55** «Гарачы лёд».
**23.25** «Відзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**00.10** Фільм «1001 рэцэпт закаханага кулінара». 1996 г.
**01.55** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**08.30** Дэтэктыўны серыял «Чыста англійскія забойствы» (Вялікабрытанія).
**09.35** Дэтэктыўная меладрама «Чацвёртая група» (Украіна). 1-я серыя.
**10.50** Дзіцячы прыгодніцкі фільм «Тапінамбуры» (СССР). 2- я серыя.
**12.10** Час футболу.
**12.40** Гаспадар.
**13.10** Кінаспробы.
**13.30** Жывы гук.
**14.15** Серыял «Пакахай мяне зноў».
**15.10** Пазакласная гадзіна.
**15.30** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**16.25** Усё аб бяспецы.
**16.55** Дэтэктыўная меладрама «Чацвёртая група» (Украіна). 2-я серыя.
**17.55** Дэтэктыўны серыял «Чыста англійскія забойствы» (Вялікабрытанія).
**19.05** Містычная меладрама «Дзікае паляванне Караля Стаха». 2-я серыя.
**20.25** Прэм'ера! Дакументальны фільм «Свет Караткевіча» («Беларусьфільм»).
**20.55** «Калыханка».
**21.10** Тэлебарометр.
**21.15** «Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**22.10** «Бітва экстрасэнсаў».
**23.20** «Пра мастацтва».
**23.45** Дыялогі аб рыбалцы.
**00.15** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».

РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**10.10** «Мой срэбны шар».
**11.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Праўда хавае хлусню».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «Сапраўднае жыццё».
**16.20** Тэлесерыял «Дворык».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.20** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Тэлесерыял «Чорная багіня». Расія.
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.00** Весткі.
**20.30** Прэм'ера. «Юрмала-2010». Фэст гумарыстычных праграм.
**21.50** Прэм'ера. Канцэрт.
**00.00** Навіны - Беларусь.
**00.10** «Дзяўчаты».

НТВ

**06.00** Сёння.
**06.05** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.25** «Мама ў вялікім горадзе».
**09.00** «У зоне адмысловай рызыкі».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00** Сёння.
**10.25** «І зноў добры дзень!».
**11.20** «Бітва за Поўнач».
**12.10** «Да суду».
**13.00** Сёння.
**13.30** Серыял «Кодэкс гонару».
**15.05** «Асабліва небяспечны!».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** «Следства вялі…».
**20.35** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**21.00** Прэм'ера. «Рускі Галівуд: Месца сустрэчы… 30 гадоў праз».
**22.30** «Нтвшнікі». Арэна вострых дыскусій.

EUROSPORT

**09.30** Плаванне. Чэмпіянат Еўропы на кароткай вадзе (Нідэрланды). Дзень 1.
**10.15** Скачкі на лыжах з трампліна. Летні Гран-пры. HS 140. Ліберац (Чэхія).
**11.15** Скачкі на лыжах з трампліна. Летні Гран-пры. HS 140. Клігенталь (Германія).
**12.30** Лыжныя гонкі. Кубак свету. Мужчыны/жанчыны. Спрынт класічна стылем. Куусама (Фінляндыя).
**14.00** Зімовыя віды спорту. Скачкі на лыжах з трампліна. Часопіс.
**14.15** Вось дык так!!!
**14.30** Лыжнае двааборства. Кубак свету. HS 142. Куусама (Фінляндыя).
**15.15** Скачкі на лыжах з трампліна. Летні Гран-пры. HS 140. Клігенталь (Германія).
**16.15** Лыжнае двааборства. Кубак свету. Гонка па сістэме Гундэрсена (Фінляндыя).
**17.00** Плаванне. Чэмпіянат Еўропы на кароткай вадзе (Нідэрланды). Дзень 2.
**19.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. Кваліфікацыя. HS 142 (Фінляндыя).
**20.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**20.10** Лыжныя гонкі. Кубак свету. Мужчыны/жанчыны. Спрынт класічна стылем. Куусама (Фінляндыя).
**21.00** Самыя моцныя людзі планеты. Ліга чэмпіёнаў. Браціслава (Славакія).
**22.00** Цімберспорт. Чэмпіянат свету. Санкт-Йохан (Аўстрыя).
**22.30** Цімберспорт. Чэмпіянат свету. Санкт-Йохан (Аўстрыя).
**23.00** Покер. Турнір Партуш (Францыя).
**00.50** «Спартовае вандраванне. Часопіс.
**01.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. Кваліфікацыя. HS 142 (Фінляндыя).
**01.45** Экстрэмальныя віды спорту. Freeride Spirit.
**02.00** Кіберспорт. Турнір Intel Extreme Masters. Кёльн (Германія).

БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** Праект «Будучыня».
**07.50** Асабісты капітал.
**08.05** Рэпартэр.
**08.30** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Загуж. Апошні прыпынак», дак. фільм, 2009 г.
**08.55** Беларусы ў Польшчы.
**09.10** Басанож па свеце: «Шчасныя выспы».
**09.35** «Зорны пірат», тэлесерыял.
**10.00** «Загадкі Мэрдака», дэтэктыўны серыял: ч. 3, 8 серыя.
**10.45** Развітанне, вяртанне…», псіхалагічная драма, 1985 г., Францыя.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Ажыятаж вакол Басі», серыял.
**17.35** «Загадкі Мэрдака», дэтэктыўны серыял: ч. 3, 8 серыя.
**18.20** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Забароненыя стужкі», дак. фільм, Польшча.
**18.55** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**19.05** Без рэтушы: «Дэструктыўная арганізацыя», рэпартаж, 2010 г., Беларусь.
**19.30** Калыханка для самых маленькіх.
**19.40** На колах.
**20.05** Перад выбарам.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** Госць «Белсату».
**21.35** «Браты-ворагі», дак. серыял, 2001 г., Францыя: «Цярпімасць і нецярпімасць».
**22.05** «Зямля запаветная», маст. фільм, 1974 г., Польшча.
**00.50** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма): «Тэлешоп».
**01.00** Аб'ектыў.

## 27 ЛІСТАПАДА, СУБОТА

**06.50** Мультфільмы.
**07.15** Існасць.
**07.40** Дзень спорту.
**07.50** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.15** Здароўе.
**09.45** Кулінарнае шоў «Кухар дома» (ЗША).
**10.20** «Аўташкола».
**11.05** Дак. цыкл «Зорнае жыццё».
**12.15** Камедыя «Ты-мне, я-табе» (СССР).
**13.55** Хакей для ўсіх.
**14.35** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**15.15** Навіны рэгіёна.
**15.35** Вакол планеты.
**16.15** «Праверка чутак».
**16.45** Nota Bene.
**17.15** Відэафільм «Больш, чым гульня».
**17.40** Відэафільм АТН « Легенды святога возера « цыклу «Зямля беларуская».
**18.00** «Ваша лато».
**18.50** Латарэя «Пяцёрачка».
**19.25** «КЕНО».
**19.30** «Беларусь адкрытая свету». Канцэртная праграма.
**21.00** Панарама.
**21.45** Дак. цыкл «Дзяржаўная палітыка».
**22.10** Фільм тыдня. Прыгодніцкі баявік «Сахара» (ЗША-Іспанія-Германія).
**00.30** Дзень спорту.

**07.00** «Суботняя раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Серыял «Мая выдатная няня».
**09.45** «Здароўе».
**10.35** «Смак».
**11.15** «Разумніцы і разумнікі».
**12.00** Фільм «Перакрыжаванне».
**13.55** «Хвіліна славы».
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Прэм'ера. «Яе ніхто такой не ведаў».
**17.25** Камедыя «Хто падставіў труса Роджэра?».
**19.30** «Адзін супраць усіх».
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Беларусь-гэта мы!».
**23.00** «Дэтэктар хлусні».
**00.05** «Што? Дзе? Калі?».
**01.20** «Пражэктарпэрысхілтан».

**06.45** «Анфас».
**07.00** Фільм «Макар - следапыт». СССР, 1984 г. 1-я серыя.
**08.05** Фільм «Рэцэпт яе маладосці». СССР, 1983 г.
**09.35** «Давай паспрабуем?».
**10.30** «Мінск і мінчане».
**11.05** СТБ прадстаўляе: «КультУРА!».
**11.40** «Салдаты. Залатыя серыі».
**13.25** «Новыя падарожжы дылетанта».
**14.00** Фільм «Дарагая Алена Сяргееўна». СССР, 1988 г.
**15.45** «Відзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.45** «Наша справа».
**17.00** «Вялікі горад».
**17.35** Фільм «Буйнагабарытныя». Расія, 2005 г.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10** «Зорны рынг».
**21.30** Фільм «Адгадай, хто?». ЗША, 2005г.
**23.25** Фільм «Калядны катэдж». ЗША-Канада, 2008 г.
**01.15** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

**07.10** Усё аб бяспецы.
**07.35** «Рэальны свет».
**08.05** Дыялогі аб рыбалцы.
**08.35** Жансавет.
**09.15** Дача здароўя.
**09.50** Гісторыка-прыгодніцкі фільм «Гардэмарыны-ІІІ» (Расія - Германія).
**12.05** «Фэст пачуццяў». Канцэртная шоў-праграма (Германія).
**13.50** Тэлебарометр.
**13.55** «Запал па культуры».
**14.40** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Астан Віла - Арсенал. Прамая трансляцыя.
**16.55** Гандбол. Кубак выкліку. СКА (Мінск) - АЕК (Афіны). Прамая трансляцыя.
**18.30** «Смешныя людзі». Гумарыстычная праграма (Расія).
**20.00** Тэлебарометр.
**20.05** Джэймс Бонд - Агент 007. Прыгодніцкі баявік (Вялікабрытанія-ЗША).
**22.30** Жывы гук.
**23.15** Камедыя «Прывітанне, Біл!» (ЗША).

РОССИЯ

**07.00** Фільм «Жыццё спачатку».
**08.20** Канцэрт.
**10.25** «Ранішняя пошта».
**11.00, 14.00** Весткі.
**11.10** «Суботнік».
**11.50** Мультфільмы.
**12.05** Фільм «Мая вуліца».
**13.30** «Нататкі натураліста».
**14.15** «Сумленны дэтэктыў».
**14.50** «Шукальнікі». Дак. фільм.
**15.50** Фільм «Увага! Усім пастам…».
**17.20** «Суботні вечар».
**19.00** Прэм'ера! «Карціна свету».
**20.00** Весткі ў суботу.
**20.45** Тэлесерыял «Сваты-2».
**23.05** Фільм «Сапраўднае каханне». 2009 г.

НТВ

**07.35** «Агляд».
**08.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**08.20** «Авіятары».
**08.50** «Выратавальнікі».
**09.25** «Жывуць жа людзі!».
**10.20** «Галоўная дарога».
**10.50** «Кулінарны паядынак».
**11.55** «Кватэрнае пытанне».
**13.25** «Жаночы погляд».
**14.10** Прыгодніцкі фільм «Ямакасі-2: Дзеці ветру».
**16.25** Прэм'ера. «Нона і Слава. Жорсткі раман».
**17.25** «Вочная стаўка».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.30** «Прафесія Рэпарцёр».
**20.05** «Праграма Максімум».
**21.15** «Руская сенсацыі».
**22.20** «Ты не паверыш!».
**23.25** «Музычны рынг НТБ».
**00.45** Баявік «Падводная ракіроўка».

EUROSPORT

**09.30** «Еўраспорт за чыстую планету».
**09.35** Вось дык так!!!
**09.45** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. Кваліфікацыя. HS 142 (Фінляндыя).
**10.30** Лыжнае двааборства. Кубак свету. HS 142. Куусама (Фінляндыя).
**11.15** Лыжныя гонкі. Кубак свету. Мужчыны/жанчыны. Спрынт класічна стылем. Куусама (Фінляндыя).
**12.00** Лыжныя гонкі. Кубак свету. Жанчыны. 5 км. Класічны стыль (Фінляндыя).
**12.30** Санкавы спорт. Кубак свету. Жанчыны. Іглс (Аўстрыя). Спроба 2.
**13.30** Лыжныя гонкі. Кубак свету. Мужчыны. 10 км. Класічны стыль (Фінляндыя).
**14.30** Зімовыя віды спорту. Скачкі на лыжах з трампліна. Часопіс.
**14.45** Лыжнае двааборства. Кубак свету. HS 142. Куусама (Фінляндыя).
**15.15** Лыжнае двааборства. Кубак свету. Гонка па сістэме Гундэрсена (Фінляндыя).
**16.00, 01.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. Каманднае спаборніцтва. HS 142. Куусама (Фінляндыя).
**17.45** Плаванне. Чэмпіянат Еўропы на кароткай вадзе (Нідэрланды). Дзень 3.
**19.00** Горныя лыжы. Кубак свету. Жанчыны. Слалам-гігант. Аспен (ЗША). Спроба 1.
**20.00** Плаванне. Чэмпіянат Еўропы на кароткай вадзе (Нідэрланды). Дзень 3.
**20.30** Горныя лыжы. Кубак свету. Мужчыны. Хуткасны спуск. Лэйк-Луіс (Канада).
**22.00** Горныя лыжы. Кубак свету. Жанчыны. Слалам-гігант. Аспен (ЗША). Спроба 2.
**22.55** Снежны выходны. Агляд. Часопіс.
**23.00** Кікбоксінг. Сусветная серыя. Амстэрдам (Нідэрланды).
**00.00** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб. Klash. Германія.

БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** На колах.
**07.50** Госць «Белсату».
**08.05** Калыханка для самых маленькіх.
**08.45** «Ажыятаж вакол Басі», серыял.
**09.15** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**09.25** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Забароненыя стужкі», дак. фільм, Польшча.
**10.00** Без рэтушы: «Дэструктыўная арганізацыя», рэпартаж, 2010 г., Беларусь.
**10.20** «Браты-ворагі», дак. серыял, 2001 г., Францыя: «Цярпімасць і нецярпімасць».
**10.50** Перад выбарам.
**11.35** «Зямля запаветная», маст. фільм, 1974 г., Польшча.
**14.25** «Машына зменаў», серыял.
**14.55** Асабісты капітал.
**15.10** «Чаму дэмакратыя?», цыкл рэпартажаў: «Жалезныя лэдзі Ліберыі», 2007 г., ЗША.
**16.05** «Ранча», серыял: 7 серыя.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05, 21.10** «Перадвыбарчыя партрэты», дак. цыкл.
**17.10** «Арол: крымінальная сага», серыял.
**18.05** Незвычайнае жыццё звычайных людзей: «Раскіданы дом», дак. фільм, Польшча.
**18.40** Макрафон: канцэрт «Іх N.R.M – іх Мроя».
**19.05** Тыдзень з радыё «Свабода».
**19.35** Калыханка для самых маленькіх.
**19.40** Еўропа сёння.
**20.05** «Мультклуб».
**20.10** Вагон.
**20.20** Моўнік (паўтор).
**20.35** Навігатар.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.15** «Слуцкі збройны чын», дак. фільм, 2008 г., Беларусь.
**21.45** Суботні сеанс: «Жаночы раман», маст. фільм, 2005 г., Чэхія.
**23.20** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма): «Забабоны».
**23.30** Аб'ектыў.

ЦІКАВА

# РАСПРАНУЦЦА — І Ў ПАРЛАМЕНТ

Алег НОВІКАЎ

**Скандальная арганізацыя FEMEN мае намер далучыцца да грамадскіх пратэстаў у Беларусі. Ці трэба беларускай апазіцыі радавацца з'яўленню новага саюзніка?**

Пра намер прыняць удзел пратэстах на плошчы заявіла адна са стваральнікаў групы Ганна Гуцол: «Мы б з задавальненнем прыехалі (у Мінск), але, на жаль, мы вельмі абмежаваныя ў фінансавых рэсурсах, і калі знойдуцца людзі, якія гатовыя нас проста прыняць і сарганізаваць, чаму б не? Я думаю, супольна мы маглі б сарганізаваць вельмі цікавае мерапрыемства», — лічыць Ганна.

Тое, што мерапрыемства сапраўды будзе цікавым, няма сумневу. Амаль усе акцыі FEMEN прыцягваюць вялікую ўвагу прэсы. Не кожны дзень у нашых шыротах маніфестанты, тым больш маладыя дзяўчаткі, дэманструюць свае прыгажосці ў рамках палітычных акцый.

Лічыцца, што арганізатарамі руху з'яўляюцца Ганна Гуцол і Аляксандра Шаўчэнка, якія прыехалі ў Кіеў з правінцыйнага Хмяльніцкага. Папрацаваўшы некаторы час і пажыўшы ў вельмі сціплай кватэры, дзяўчыны задумаліся пра тое, каб падацца ў грамадскую дзейнасць. І прыдумалі FEMEN.

Усё пачалося з перформансу «Украіна — не бардэль», якую дзяўчыны арганізавалі на знак пратэсту супраць таго, што падчас турніру «Еўра–2012» краіна можа ператварыцца ў вялікі рынак прастытутак.

Пасля група запомнілася сeрыяй эфектных перформансаў. Так, улетку 2008 года, калі ў Кіеве пачаліся планавыя адключэнні гарачай вады, дзяўчыны ў купальніках з мылам і тазікамі сталі мыцца ў фантанах на Майдане Незалежнасці. «Няма вады ў кране — мыюся на Майдане!» — скандзіравалі яны.

Пасля прыходу да ўлады Віктара Януковіча арганізацыя сышла ў палітыку. Яшчэ падчас прэзідэнцкіх выбараў яе сябры распрануліся на ўчастку, дзе павінен быў прагаласаваць Януковіч. Пасля прайшліся да офісу Службы бяспекі Украіны, патрабуючы адстаўкі яе шэфа. Некаторых сяброўак FEMEN пасля выклікалі на допыты, і нават адлічылі з ВНУ. Апошняй гучнай акцыяй сталі кастрычніцкія пратэсты ў дзень візіту Пуціна. У традыцыйных касцюмах Евы дзяўчаткі скандавалі: «Украіна — не Аліна» (па чутках, у Пуціна ёсць каханка Аліна).

Праўда, часам пратэсты FEMEN вельмі двухсэнсоўныя. Так, напярэдадні мясцовых выбараў 31 кастрычніка ў інтэрнэце з'явіліся плакаты з тэкстам «Дастань з п...ы нацыянальны гонар». На выяве — пашпарт грамадзяніна Украіны, які знаходзіцца паміж жаночымі ягадзіцамі. Пасыл кампаніі FEMEN быў наступны: «Твой голас — твая зброя, ён моцны і магутны, адзіны, які ты маеш. Не аддавайся палітыкам ад улады ці апазіцыі — май уласнае меркаванне і адстойвай яго».

Што ж атрымалася ў выніку? Прэса СНД, перш за ўсё дэмакратычная, у захапленні ад новых формаў грамадскага пратэсту. Апазіцыйная радыёстанцыя «Эхо Москвы» сцвярджае: «За апошні год жаночы рух FEMEN ператварылася ў яшчэ адзін фірмовы знак, вядомы знак Украіны разам з Чарнобылем, аранжавай рэвалюцыяй, баксёрамі Клічко і футбалістам Андрэем Шаўчэнкам. Ніхто не ведае, дзе і калі з'явяцца і супраць чаго будуць у чарговы раз пратэставаць аголеныя студэнткі ва ўкраінскіх вяночках».

Аднак рэакцыя ўкраінскага соцыуму на акцыі FEMEN больш разнастайная.

Па-першае, змагаркі за правы жанчын не карыстаюцца падтрымкай арганізаванага феміністкага руху. Канцэпцыі акцый FEMEN супярэчаць нават самой назве гэтай арганізацыі, паколькі дзяўчаткі падкрэсліваюць палавую няроўнасць, робячы стаўку на жаночае цела. «Сапраўдныя» феміністкі абураны тым, што пратэсты супраць прастытуцыі, якія праводзяцца ва ўзятых з сэкс-салонаў касцюмах, насамрэч з'яўляюцца рэкламай украінскіх прастытутак і стымулююць працэс гандлю ўкраінскімі жанчынамі.

Самі актывісткі так не лічаць. Ганна Гуцол тлумачыць: «FEMEN прынёс ідэю вольнай жанчыны, актыўнай жанчыны. Жанчына, якая пратэстуе — гэта нармальна. Голая пратэстуючая жанчына цяпер успрымаецца 50 на 50. Праз нас прайшло каля 800 дзяўчат у Кіеве. Мы ведаем, што гэтыя дзяўчыны не будуць анучамі, не патрапяць у прастытуткі. Тое, што мы ёсць, кажа пра тое, што ў краіне ёсць дэмакратыя — дзяўчыны пратэстуюць. Можа, дзякуючы менавіта нам прыйшло 20 мільёнаў інвестыцый у краіну, таму што Еўропа бачыць, што ў нас — дэмакратыя. Калі раней усе думалі, што ўкраінская дзяўчына — прастытутка, тое зараз усё ведаюць, што ўкраінская дзяўчына — гэта FEMEN».

Аднак, калі меркаваць па каментарах на ўкраінскіх форумах, у гэтай спрэчцы рацыю маюць феміністкі.

Шмат мужчын рэагуе на фотарэпартажы з акцый FEMEN фразамі кшталту: «Вось гэта грудзі!» А часам можна сустрэць рэакцыю жанчын, якія ніякага захаплення ад падобнай дэманстрацыяй ідэяй вольнай жанчыны не маюць. Вось што напісала карыстальніца Каця з Херсону пасля таго, як у яе горадзе FEMEN арганізаваў перформанс «Бабы, уставайце»: «Гэтых паганак трэба папросту абліць кіпенем. Самыя натуральныя прастытуткі, якіх трэба прыцягнуць да крымінальнай адказнасці за гвалтаванне і голыя азадкі. Баб у Херсоне няма, а ёсць жанчыны! А вас, сцерваў, трэба адсюль гнаць».

Старыя людзі ўспрымаюць такую грамадскую актыўнасць цалкам адмоўна. «Ліміта, якая атрымлівае капейкі за рабскую працу, вырашыла, што калі аголіць свой зад, яна зможа прабіцца ў людзі!.. Ганьба вам — маленькія, амаральныя, брудныя лесбіянкі!.. Як вашым бацькам глядзець у вочы суседзям?» — піша карыстальнік Уладзіслаў.

Выключэнне тут складаюць маладыя людзі, якія выраслі ў час сексуальнай рэвалюцыі і не маюць комплексаў. Яны вітаюць тое, што робіць FEMEN. Аднак нават тут не ўсё так проста.

Па-першае, той факт, што група ўзнікла напярэдадні прэзідэнцкай кампаніі 2009 года, выклікаў падазрэнні ў тым, што FEMEN стварылі для працы супраць Цімашэнка: «Голыя бабы на вуліцах — гэта раздражняючая абывацеля ілюстрацыя хаосу ў краіне», — запэўнівае адзін з дэпутатаў Блока Юліі Цімашэнка.

Па-другое, па яго словах, FEMEN — гэта таксама ўцягванне моладзі ў антыпалітыку. Сваімі акцыямі FEMEN спрыяла ідэі, што галасаваць няма за каго. Моладзь, якая галасавала супраць усіх, дапамагла Януковічу стаць прэзідэнтам.

На заканчэнне варта працытаваць версію карыстальніка Ігната: «Мне няма справы да таго, шчыра яны гэта робяць ці за грошы. (Хоць, калі працу страцілі, за якія грошы жывуць?) Але палохаць мужыкоў голымі грудзьмі — гэта безнадзейна. Пацешыць — можна. Калі іх цікавіць вынік — над ім трэба працаваць доўга і зацята. Тады пасля вучобы будзе шанец чагосьці дасягнуць, аднак гэтым шанцам трэба яшчэ скарыстацца. І атрымліваецца такая вось барацьба незразумела з кім і за што. А хутчэй, супраць усіх і супраць усяго без надзеі на вынік».

Паколькі самі сябры руху звычайна блытаюцца ў паняццях фемінізму, узнікае думка, што яны людзі далёка не ідэйныя. Застаюцца дзве версіі: або гэта папросту артыстычная правакацыя ці асабістая рэклама, або дзяўчынам за гэта плацяць. Той, хто хоць нейкі час стала жыў ва Украіне і ведае мясцовыя правілы гульні, хутчэй падумае пра другое... Журналісты і палітыкі ўпэўненыя, што рух мае спонсараў, аднак, трэба прызнаць, што дасюль ніякіх доказаў гэтаму няма.

Між тым, у Ганны Гуцол узнікла новая ідэя — стварыць партыю і паспрабаваць прайсці ў Вярхоўную Раду на выбарах наступнага года. «Распрануцца і пайсці ў парламент — гэта ідэя!» — кажа яна.

Гуцол і Шаўчэнка клянуцца, што ніхто ім не дапамагае. Дзяўчыны сцвярджаюць, што дагэтуль жывуць у здымных кватэрах, не маюць ні машын, ні зберажэнняў. Між тым, яны прызналі, што пры арганізацыі існуе савет, які дае невялікія грошы.

«Дагуляюцца ці да паспяховага шлюбу, ці да турмы», — прыкладна гэтак ставяцца да гэтых жаночых выбрыкаў мужчына ў Вярхоўнай радзе Украіны.





FEMEN не першы раз шакуе ўкраінскую сталіцу. Напрыканцы мая, калі «Кіеўэнэрга» выключыў гарачую ваду ў інтэрната, студэнткі наладзілі акцыю «Няма вады ў кране — мыюся на Майдане!». Безумоўна, ваду адразу ж не ўключылі, але размоваў у Кіеве пра мокрых дзяўчын у фантане было нямала.

## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Ратыфікацыя беларускім парламентам дамовы з Польшчай аб памежным руху значыць радыкальнае спрашчэнне ўмоў для візітаў у наш край жыхароў Гродна і Брэста. Гэта сігнал, што Мінск, відавочна, хоча палепшыць адносіны з нашай краінай. Хаця дамова вельмі карысная для Беларусі, яе ратыфікацыі хацела больш Варшава. Калі мы збіраемся пераканаць беларусаў звярнуць увагу ў бок Еўропы, патрэбна, каб яны маглі прасцей падарожнічаць у Еўропу.

**«Rzecz Pospolita» (Польшча)**

Неабходна адзначыць, што пераадоленне апазіцыйнымі кандыдатамі (Някляеў і Саннікаў) віруса палітычнай раздробленасці, які даўно і трывала прысутнічае ў беларускім апазіцыйным полі, будзе зразумета выбаршчыкамі як знак вяртання разумнага палітычнага сэнсу ў апазіцыйныя шэрагі. З пункту гледжання беларускіх выбаршчыкаў, пераадоленне раздробленасці — гэта свайго роду пацверджанне сур'ёзнасці намераў апазіцыі канкураваць з Лукашэнкам на выбарах.

**«РЕГНУМ» (Расія)**

Мінск пакажа свету золата. Лідэр Беларусі заяўляе пра рэзкае ўзбагачэнне свайго народа за кошт золата. Жоўты метал «Бульбяной дзяржавы» неўзабаве здзівіць Еўропу і Расію. Дэвальвацыя беларускага рубля — усяго толькі міф.

**«Глобалист» (Расія)**

Гаворка не ідзе пра перадачу былой дзяржаўнай маёмасці ў прыватную ўласнасць, што дагэтуль выклікала страх. Гаворка ідзе ў большай ступені пра канвертацыю палітычнай улады наменклатуры ў эканамічную ўладу, пры якой самыя смачныя яе кавалкі непразрыста і танна пяройдуць ва ўласнасць невялікага пула абраных. У той жа час пэўная частка маёмасці па даражэйшым кошце прызначаная, магчыма, для замежных фундатараў. Той факт, што размовы пра прыватызацыю раптам сталі актуальнымі, звязаны не з эканамічным крызісам, а з апетытам нашчадкаў у асяроддзі эліты: дзеці падраслі.

**«Die Presse» (Аўстрыя)**

«Мэты гэтага спектаклю (канфрантацыя Масквы і Мінска) наступныя — адцягненне ўвагі Захаду ад умацавання і паляпшэння адносін паміж Расіяй і Украінай. Таксама значна паменшыцца рызыка для Расіі стаць ахвярай агрэсіі ЗША ў «гандлёвай» ці «валютнай» вайне. Такім чынам, канфлікт паміж Расіяй і Беларуссю перш за ўсё з'яўляецца нічым іншым, як тонкай палітычнай гульнёй з далёкасяжнымі планамі.

**«Биржевой лидер» (Расія)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### ГРУЗІЯ. САРВАЦЬ АЛІМПІЯДУ Ў СОЧЫ

Грузінскі ўрад прыдумаў, як адпомсціць Маскве за падтрымку абхазскіх і асецінскіх сепаратыстаў. У Тбілісі вырашылі ўзняць на міжнародным узроўні пытанне чэркесаў. Задача максімум — сарваць Алімпіяду ў Сочы ў 2014 годзе. Сутнасць кампаніі: нагадаць, што Сочы — гістарычная зямля чэркесаў, якую яны страцілі ў выніку Каўказскай вайны. Саміх чэркесаў прымусілі эміграваць у Турцыю. А гэта, на думку чэркескіх арганізацый у Турцыі і ўраду ў Тбілісі, не што іншае, як генацыд, а сама Алімпіяда на месцы знішчэння нацыі — гэта папросту блюзнерства. У грузінскай сталіцы ўжо адбылася першая канферэнцыя на гэту тэму. Увогуле, чэркескі накірунак — частка больш маштабнай палітыкі грузін на Паўночным Каўказе.

**Па матэрыялах «Грузия Сегодня» (Грузія)**

### ІСПАНІЯ. СУДЗЯЦЬ ЛІДЭРА БАСКАЎ

Пачаўся судовы працэс над Арнальда Атэгі і яшчэ некалькімі актывістамі руху за незалежнасць Краіны Баскаў. Арнальда — лідэра забароненая партыі «Батасуна» — абвінавачваюць у праслаўленні тэрарызму. 14 лістапада 2004 года ён арганізаваў мітынг сяброў партыі. Паколькі «Батасуна» з'яўляецца палітычнай вітрынай арганізацыі ЕТА, сход палічылі праслаўленнем тэрарызму. Пра тое, што справу замовілі, піша нават блізкая да ўраду прэса. Атэгі — ключавая фігура ў нацыяналістычным руху, які шукае схемы, як вярнуць партыі легальны статус (да забароны «Батасуна» збірала 12–15 працэнтаў галасоў баскскага электарату). Таксама выклікае крытыку форма следства: не чакаючы рашэння суда, год таму Атэгі пасадзілі за краты ў рамках прэвентыўнага арышту. Нічога дзіўнага няма ў тым, што сёння ў ягоную падтрымку выступаюць не толькі нацыяналісты, аднак і ідэйныя праціўнікі Атэгі. Так, сведкам абароны будзе адзін з лідэраў баскскай секцыі Іспанскай сацыялістычнай рабочай партыі (PSOE), якая чыніць моцны ціск на нацыяналістаў.

**Па матэрыялах іспанскай прэсы**

### КАЗАХСТАН. ПІСЬМЕННІК ЧЫТАЕ ДУМКІ ПРЭЗІДЭНТА

Афіцыйная газета «Казахстанская праўда» паведаміла, што 5 лістапада, прэзідэнт Нурсултан Назарбаеў падчас прыёму старшыні фінансавай паліцыі Кайрата Кажамжарава сказаў наступнае: «У айчынных СМІ нярэдка крытыкуецца барацьба з карупцыяй. У прыватнасці, сцвярджаецца, што ў рукі правасуддзя трапляе галоўным чынам «дробная рыбка». Але, калі затрымліваюцца буйныя асобы, пачынаецца супрацьдзеянне, ідзе шальмаванне праваахоўных органаў, выяўляецца абарона карупцыянераў». У гэты ж дзень у газеце «Егемен Казахстан» выйшаў артыкул пісьменніка Бексултана Нуржакеева пад загалоўкам «Захавайце казахскае адзінства!». У гэтым матэрыяле аўтар таксама закранае праблему карупцыі. «Я яшчэ не забыўся, што ў некаторых газетах пішуць, што да адказнасці прыцягваюць «дробную рыбу», а буйных асобаў не чапаюць», — піша Бексултан Нуржакееў. Зараз усе ламаюць галовы: як магло здарыцца такое супадзенне. Або пісьменнік адгадаў думку прэзідэнта Назарбаева? Або Нурсултан піша тэксты для Бексултана?

**Па матэрыялах казахскай прэсы**

### ПОЛЬШЧА. БОЙКА Ў ДЗЕНЬ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ

У Польшчы адзначалі нацыянальнае свята — Дзень незалежнасці. Як вядома, 11 лістапада 1918 года была аднаўленая польская дзяржаўнасць. Гэты год унёс вялікія карэктывы ў фармат святкавання. Усё з-за правых радыкалаў з арганізацый Нацыянальны радыкальны лагер і Агульнапольская моладзь, якія заявілі пра намер арганізаваць «Марш незалежнасці». Левыя ўспрынялі навіну як спробу рэвізіі гісторыі Польшчы. Вядома, што першы ўрад незалежнай Польшчы фармавалі сацыялісты. Сябрам Польскай сацыялістычнай партыі (PPS) доўгі час быў Пілсудскі. У той жа самы час Раман Дмоўскі — ідэйны бацька польскіх правых — выступаў за саюз з Расіяй.

11 лістапада на вуліцу выйшлі калоны і левых, і правых. Усё закончылася бойкай і арыштамі 33 чалавек, пераважна з лагеру левых.

**Па матэрыялах «Lewica» (Польшча)**

### АЎСТРЫЯ. ЭКОЛАГІ ЎЗЯЛІ ВЕНУ



Марыя Васілякоў

Галоўным пераможцамі на выбарах у мэрыю сталіцы Аўстрыі была Свабодная партыя Аўстрыі (FPO), якая атрымала 25 працэнтаў галасоў. Аднак ва ўрад партыя не трапіла, паколькі ісці з імі ў кааліцыю маглі выключна кансерватары з Народнай партыі, якія атрымалі толькі 14 працэнтаў. Усё залежала ад сацыял-дэмакратаў (44 працэнты). У выніку ружовыя зрабілі стаўку на Зялёных (12 працэнтаў), якія ўпершыню ў гісторыі прарваліся ў кіраўніцтва горада дзякуючы лідэру эколагаў Марыі Васіляюоў (Maria Vassilakou). Цяпер яна будзе віцэ-мэрам. На першай прэс-канферэнцыі Марыя і мэр Вены Міхаэль Хаўпль прапанавалі сваю праграму, якая ўтрымлівае шмат экалагічных рэчаў. Так, Марыя абяцае на 33 працэнты скараціць колькасць прыватных аўтамабіляў у горадзе за кошт развіцця публічнага транспарту і ўвядзення падаткаў на машыны, якія едуць праз гістарычны цэнтр.

**Па матэрыялах «Tageszeitung» (Германія)**

ФЕНОМЕН

# ЭВІТА ВЯРНУЛАСЯ

**Алег ПЯТРОЎ**

**Смерць былога прэзідэнта Аргенціны Нестара Кіршнера выклікала нацыянальны шок і надала руху пераністаў другое дыханне.**



Нестар Кіршнер, 54-ы прэзідэнт Аргенціны, памёр 27 кастрычніка 2010 года. Яго смерць для ўсіх стала нечаканай, хаця ў гэтым годзе яму зрабілі ўжо дзве аперацыі на сэрцы. Нябожчыку было ўсяго 50 гадоў.

Як толькі паступіла смутная інфармацыя, газеты надрукавалі некрологі, гісторыкі зрабілі каментары наконт месца палітыка ў гісторыі, чыноўнікі склалі пратакол афіцыйных мерапрыемстваў, урад абвясціў нацыянальную жалобу. Аднак пасля адбылося нешта такое, чаго ніхто не чакаў.

Нягледзячы на тое, што на гадзінніку была глыбокая ноч, на Майскай плошчы (цэнтральная плошчы Буэнас-Айрэса), пачалі збірацца людзі. Зранку тут стаяў натоўп у некалькі сотняў тысяч чалавек. Гэты сход ніхто не арганізаваў. Ніводная партыя або прафсаюз не заклікалі ісці да Ружовага Палацу (адміністрацыя прэзідэнта). Абсалютная меншасць з прысутных былі сябрамі пераніскага руху, які ўзначальваў нябожчык. Аднак нейкі калектыўны імпульс прымусіў аргенцінцаў прыйсці сюды (на плошчы былі тыя, хто праехаў больш за тысячу кіламетраў, каб развітацца з Кіршнерам). Нацыя рыдала. Федэрацыя па футболу адмяніла ўсе сустрэчы на тыдзень наперад. Палітолагі згодныя, што культ Кіршнера, які нараджаецца на вачах, зменіць палітычную палітру.

Можа падавацца смешным, аднак пры жыцці цяперашняга нацыянальнага героя часцей называлі «пінгвін» (мянушка звязана з тым, што Нестар паходзіць з Санта-Круз, самай халоднай правінцыі Аргенціны) або папросту «К».

Праўда, і раней Нестар Кіршнер — сын нашчадкаў эмігрантаў з Харватыі і Швейцарыі — выдаваў сюрпрызы. Ён прыйшоў да ўлады ў 2003 годзе пры вельмі дзіўных абставінах. Па выніках першага туру прэзідэнцкіх выбараў у другі выйшлі два кандыдаты ад лагеру пераністаў. Нестар — пратэжэ тагачаснага прэзідэнта, і Карлас Менем, які ўжо пабываў гаспадаром Ружовага палацу.

Кіршнер набраў 22 працэнты, а яго канкурэнт — 24. І тут Менем чамусьці адмовіўся ад далейшага ўдзелу ў выбарах. Адпаведна, мала каму вядомы Нестар Кіршнер, губернатар правінцыі Санта-Круз, аўтаматычна зрабіўся прэзідэнтам. Яшчэ ніколі ў аргенцінскай гісторыі лідэрам нацыі не станавіўся палітык, які меў такі нізкі ўзровень электаральнай падтрымкі.

Кіршнер аказаўся трэцім прэзідэнтам краіны за тры гады. Лічылася, што ён працягне сумную традыцыю. Аргенцінская эканоміка ляжала ў руінах з-за наступстваў эканамічнага калапсу 2001 года. Песа ў выніку дэнамінацыі страціў больш за 70 працэнтаў сваёй былой вартасці. Нацыянальны доўг на 2003 год узняўся да 178 мільярдаў долараў. Банкаўскія дэпазіты грамадзян давялося замарозіць.

Аднак Кіршнер і яго міністр эканомікі выцягнулі краіну. Ім часткова дапамог той факт, што Міжнародны валютны фонд, па чым рэцэптам жыла краіна, аказаўся ў вачах усёй Лацінскай Амерыкі адказным за дэфолт 2001-га. Банкірам было так не ўтульна, што яны нейкім чынам скарацілі аргенцінскі доўг да 84 мільярдаў. Але і яго хутка таксама рэструктурызавалі. У выніку на чацвёртым годзе эры прэзідэнта Кіршнера Аргенціна цалкам разлічылася з МВФ. Адначасова пачаўся эканамічны бум, якога, праўда, трэба было чакаць. Дэнамінацыя песа прывяла да нізкага сабекошту вытворчасці аргенцінскіх тавараў і росту экспарту.

Калі прыйшоў час прэзідэнцкай кампаніі 2007 года, папулярнасць «пінгвіна» складала 60 працэнтаў. Ён мог лёгка застацца на пасадзе, аднак адмовіўся на карысць сваёй другой паловы Крысціны Кіршнер, якая хутка стала прэзідэнтам.

Фармальна пакінуўшы прэзідэнцкую пасаду (СМІ сцвярджаюць, што ён фактычна і далей кіраваў краінай), Кіршнер заняўся рэгіянальнай інтэграцыяй, партыйным будаўніцтвам пераністаў. Акрамя таго, ён час ад часу публічна падтрымліваў жонку, у якой хапае праблем — глабальны эканамічны крызіс не пашкадаваў Аргенціну. Гэта, праўда, слаба дапамагла Крысціне, якая да нядаўняга часу стабільна губляла давер.

У дастаткова роўнай біяграфіі Кіршнера сёння стараюцца знайсці сакрэты яго цяперашняй папулярнасці. Правыя і ліберады ўказваюць на тое, што ён адмяніў амністыі для лідэраў вайсковай дыктатуры 1976–1983 гадоў. Пры Кіршнеры тыя, хто катаваў апазіцыянераў, аказаліся ў турмах. Аднак гэтыя панегірыкі здаюцца штучнымі. Калі Кіршнер быў прэзідэнтам, ліберальная прэса моцна крытыкавала яго за аўтарытарны стыль кіравання, за тое, што выканаўчая ўлада падпарадкавала сябе парламенцкую (прэзідэнт выдаў рэкордную колькасць дэкрэтаў), за тое, што Нестар маніпуляваў статыстыкай. «Wall Street Journal» прысудзіла «К» тытул «антырынкавы палітыкі».

Гэта яшчэ не ўсё. Кіршнер меў выразныя крытычныя погляды на дзейнасць МВФ, які нёс адказнасць за крызіс 2001 года. Напрыканцы сваёй кадэнцыі ў яго склаліся вельмі сяброўскія адносіны з Уга Чавесам. Ён нават назваў Венесуэлу «краінай сапраўднай дэмакратыі, якая абаранае годнасць свайго народа». Калі французскую кампанію «Suez» абвінавацілі ў кепскай якасці вады ў сталічнай каналізацыі, прэзідэнт падпісаў закон аб разрыве кантакту з французамі. Як прыхільнік большай ролі дзяржавы ў эканамічным жыцці, ён стварыў у 2004 годзе дзяржаўную энергетычную кампанію. Пасля ўрад увогуле стаў кантраляваць камунальныя кошты. У 2008 годзе ён паспрабаваў прывесці пераніскую партыю ў шэрагі Сацінтэрну.

Тое, што Кіршнер быў левым палітыкам, больш адпавядае ісціне. Аднак нават самі левыя прызнаюць — тое, што адбываецца, нельга зразумець праз схемы дыялектычнага матэрыялізму.

«Можна казаць пра містыцызм перанізму, які адклаўся ў гістарычнай свядомасці аргенцінскага народа і сёння праяўляе сябе, — піша вядучае левае выданне Лацінскай Амерыкі «Rebellion». — Цэлыя генерацыі аргенцінцаў выраслі на міфе пра добрага Хуана Перона і яго ягоную верную жонку Эвіту. І вось цяпер міф стаў рэальнасцю».

Праўда, цяпер не зразумела, што рабіць далёка не харызматычнай Крысціне, якой, у адпаведнасці з формулай міфу, адразу прыпісалі рысы славутай Эвіты Перон. «Трымайся, Крысціна», «Крысціна, мы з табой», «Крысціна, наперад!» — такія тэксты былі на транспарантах, якія неслі ўдзельнікі пахавальнай працэсіі.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# СУПРАЦЬ ЦЯГНІКА СМЕРЦІ

**У Германіі закончыліся антыатамныя пратэсты ў Гарлебене. У акцыях упершыню прыняла ўдзел беларуская дэлегацыя. Яўген Герасіменка, удзельнік падзей, актывіст Беларускай партыі «Зялёныя», падзяліўся сваімі ўражаннямі ад пабачанага з журналістам «НЧ» Алегам Новікавым.**



***— Хаця кадры з выявай пратэстуючых немцаў амаль кожны дзень ішлі па «Euronews», напэўна, ёсць сэнс яшчэ раз растлумачыць чытачу, што такое Гарлебен і ў чым сутнасць канфлікту?***

— Гарлебен — гэта невялікая вёска ў зямлі Ніжняя Саксонія. Яе насельніцтва складае прыкладна 600–800 чалавек. Аднак пра Гарлебен ведае кожны немец, паколькі побач з вёскай знаходзяцца атамныя магільнікі. Тут хаваюць адыходы нямецкіх АЭС, якія вязуць сюды на цягніку пасля перапрацоўкі з Францыі ў спецыяльных кантэйнерах. Той цягнік называюць у прэсе «цягнікам смерці», таму што колькасць радыеактыўнага матэрыялу на ім роўная некальким Чарнобылям. Традыцыя пратэставаць супраць канвою, які таксама называюць «Кастар» (кампанія — вытворца кантэйнераў для атамнага смецця), узнікла яшчэ на пачатку 1980-х гадоў. Звычайна акцыі пачынаюцца, як толькі цягнік перасякае французска-нямецкую мяжу. Эколагі спрабуюць затрымаць састаў любымі сродкамі. Адгортваюць шчэбень з-пад рэек, прыкоўваюць сябе да іх кайданкамі, скачуць на кантэйнеры з дрэваў. У сваю чаргу, паліцыя спрабуе не дапусціць правакацый. Над цягніком увесь час лятае верталёт. Наперадзе «Кастара» едзе спецыяльная платформа з паліцэйскімі. Кульмінацыі пратэсты дасягаюць на подступах к Гарлебену, калі пачынаюцца спробы блакады чыгункі і аўтамабільнай трасы, якая непасрэдная вядзе да месца магільніку. Тут часам канвой рухаецца з хуткасцю тры метры ў гадзіну.

***— Гарлебен–2010 чымсьці адрозніваўся ад папярэдніх?***

— Пасля таго, як урад зялёных і сацыял-дэмакратаў напрыканцы 1990-х прыняў закон пра вывад усіх нямецкіх АЭС з эксплуатацыі на працягу 25 гадоў, антыатамны рух палітычна стаў менш значным. Увосень гэтага года кабінет Ангелы Меркель адмяніў той закон. На вуліцы Берліну адразу выйшла каля ста тысяч чалавек. Назіральнікі тады зрабілі прагноз, што ў гэтым годзе трэба чакаць вялікіх пратэстаў у Гарлебене. Так і атрымалася. У агульнай дэманстрацыі было 50 тысяч чалавек — рэкорд за ўсе часы гісторыі пратэстаў.

***— Як маленькая вёска змагла пераджыць навалу такой колькасці людзей?***

— Натуральна, Гарлебен не можа прыняць так шмат. Дапамагаюць фермеры, якія даюць свае палі пад намётавыя лагеры і месцы для дэманстрацый. У Гарлебене, дарэчы, вельмі моцная антыатамная культура. Амаль над кожным будынкам можна пабачыць сцяг з жоўтым крыжам — знак «Стоп АЭС». Або каля ўваходу ў дом стаіць бочка, якая сімвалізуе атамныя адыходы. Уся дарога да магільнікаў застаўлена фермерскімі трактарамі. Мяне як беларуса ўразіла такая форма сімвалічнага пратэсту, як шыбеніцы, на якіх вісяць муляжы людзей, што сімвалізуюць ахвяраў атамнай энергетыкі. Шыбеніцы стаяць уздоўж дарог і выклікаюць супярэчлівыя пачуцці.

***— Як арганізаваныя лагеры эколагаў?***

— Такіх лагераў некалькі. Мы жылі ў намётах. Дзякуючы саломе, якую прынеслі тыя ж фермеры, спаць там было дастаткова ўтульна. У лагеры ёсць біяпрыбіральні і гарачая кухня. Зразумела, што ў лістападзе надвор'е не вельмі цёплае, аднак па-сапраўднаму холадна стала толькі ў апошнія дні. Вялікую частку быту жыхароў лагеру займаюць рознага кшталту праввыя семінары, на якіх вучацца, як сябе паводзіць падчас блакады. Напрыклад, існуе цэлы інстытут спікераў. Падчас акцый у выпадку нейкага канфлікту, перамовы з паліцыяй вядзе спецыяльна загадзя абраны чалавек. У сваю чаргу, у паліцыі ёсць таксама спікер на такія выпадкі. Акрамя савету спікераў, існуе савет абшчынаў. Сістэма дэмакратыі вельмі эфектыўная.

***— Якое ўражанне засталося ад паводзін нямецкай паліцыі?***

— У нас, беларусаў, добрае. У немцаў — вельмі кепскае. На згаданай маніфестацыі, дзе было 50 тысяч чалавек, не было ніводнага паліцэйскага. У Беларусі ў такім выпадку, напэўна, ахоўнікаў правапарадку было б больш за людзей. Паліцыя ўмяшалася толькі тады, калі анархісты з Чорнага блоку паспрабавалі перакапаць дарогу. Паліцэйскія ўвайшлі арганізаванай калонай у натоўп і былі сустрэтыя дастаткова негатыўна. Аднак ніякага гвалту з боку паліцыі я асабіста не бачыў. Нават падчас зняцця блакады, яны дастаткова карэктна бралі пратэстуючых за рукі і ногі папросту адносілі іх за 10 метраў ад чыгункі.

***— Як немцы ставіліся да беларускага дэсанту?***

— Вельмі добра. Шмат хто, як аказалася, цікавіцца тым, што адбываецца ў нас у краіне. Шмат хто выказваў удзячнасць за тое, што мы прыехалі, паколькі амаль усе ведаюць, што такое Чарнобыль. Увогуле, беларусаў сярод іншаземцаў было больш за ўсіх.

***— Што самі нямецкія эколагі думаюць пра вынікі кампаніі?***

— На думку абсалютнай большасці, гэта была самая лепшая кампанія за часы пратэстаў у Гарлебене. Так, цягніку з-за акцый эколагаў спатрэбіўся рэкордна вялікі тэрмін, каб дасягнуць фінальнай кропкі. На дэманстрацыю таксама выйшла самая вялікая колькасць людзей. Акрамя таго, Гарлебен паказаў масавую незадаволенасць немцаў атамнай палітыкай ураду. Закон аб вывадзе АЭС з эксплуатацыі быў прыняты ў выніку 10–15 гадоў грамадскіх дэбатаў. Той закон быў вялікім кампрамісам. А Меркель папросту прыйшла і ўсё скасавала.

***— Ходзяць чуткі, што наступны «Кастар» паедзе не ў Гарлебен, а на Урал у Расію, дзе ёсць свой магільнік «Маяк». Наколькі рэальны такі праект, і ці не рушыць «цягнік смерці» транзітам праз Беларусь?***

— Канцлер Ангела Меркель відавочна павінна лічыцца з маштабам акцый супраць яе закону. Яна нават заявіла, што атамная энергетыка будзе ў перспектыве выкарыстоўвацца ў выключных выпадках. На гэтай глебе, мяркую, і з'явіліся чуткі пра ўральскі праект. Аднак, на маю думку, людзі раней дабʼюцца свайго — закрыцця ўсіх АЭС у Германіі. У немцаў вельмі рашучы настрой. У гэтым плане ўразіў сімвалізм акцый. Па сутнасці, усе ведалі, што позна ці рана «цягнік смерці», нягледзячы на ўсе акцыі і блакады, дасягне сваёй мэты. Аднак людзі ўсё роўна выходзілі на блакады і дэманстрацыі, каб давесці, што ў іх ёсць грамадзянская пазіцыя, якую ўрад не мае права ігнараваць.

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ

### ІСЛАМ КАРЫМАЎ



Прэзідэнт Узбекістану заявіў пра неабходнасць пашырэння правоў парламенту. Карымаў, у прыватнасці, прапанаваў надаць парламенту права зацвярджаць кандыдатуру прэм'ер-міністра і выносіць ураду вотум недаверу. Наступствам ягонай прамовы стала сапраўдная актывізацыя парламенцкіх партый, аднак дэбаты адбываюцца ў вельмі цікавым фармаце. Паміж партыямі пачалася дыскусія з нагоды вытворчасці дзіцячых цацак. У газеце апазіцыйнай Народнай дэмакратычнай партыі Узбекістану (партыя былых камуністаў) «Узбекистон овози» быў апублікаваны артыкул пад назвай «Праблема зразумелая, а дзе яе рашэнне? Або пра тое, як ліберал-дэмакраты замест выканання ўскладзеных на іх задач, уцягваюцца ў штучныя дыскусіі». Аўтары разважаюць пра тое, што, нягледзячы на неаднаразовую крытыку, ліберал-дэмакраты (урадавая партыя) не могуць арганізаваць дзелавыя колы на вытворчасць якасных дзіцячых цацак. Далей прыводзіцца інтэрв'ю з адным ліберал-дэмакратам, які сцвярджае, што ён як прадпрымальнік не знайшоў падтрымкі з боку сваёй партыі. Адказ не прымусіў сябе чакаць. Блізкая да ўраду газета «XXI Asr» апублікавала матэрыял «Давайце ісці ад пустой крытыкі да справы». У падзагалоўку напісана: «Такая думка мімаволі прыходзіць у галаву пасля чытання артыкулаў у «Узбекистон овози». Ліберал-дэмакраты называюць апанентаў «балаболамі, якія карыстаюцца стандартнымі прыёмамі крытыкі». Палеміка вакол цацак працягваецца, і магчыма, яна выступае нейкім эрзацам нармальных палітычных дэбатаў, якія ніхто не хоча весці нават нягледзячы на абвешчаную Карымавым лібералізацыю.

### БРЫС АРТФЁ



Французскі палітык увайшоў у гісторыю як першы і, магчыма, апошні міністр нацыянальнай ідэнтычнасці. Такая незвычайная пасада была вынайдзена ў складзе французскага кабінета міністраў у 2007 годзе па ініцыятыве прэзідэнта Нікаля Сарказі. Поўны тытул Брыса гучаў так: міністр іміграцыі, інтэграцыі, нацыянальнай ідэнтычнасці і развіцця салідарнасці. У выніку рэформы ўраду, якая прайшла на пачатку тыдня, гэта міністэрства ліквідавана і на правах дэпартаменту па справах эміграцыі будзе ўключаная ў апарат МУС. Гісторыя Міністэрства нацыянальнай ідэнтычнасці — цікавая рэч. Стварэнне падобнай установы было адным з пунктаў перадвыбарчай праграмы Сарказі. Аднак само паняцце «нацыянальная ідэнтычнасць» у выніку чамусьці было прывязана да праблемы эміграцыі, што выклікала вялікія пратэсты левай грамадскасці. Увосень 2009 года міністэрства стала ініцыятарам стварэння канцэпцыі нацыянальнай ідэнтычнасці. Кампанія закончылася тым, што расісты з партыі Нацыянальны Фронт атрымалі трыбуну для прапаганды сваіх ідэй. Тры папярэднія прэм'еры ад партыі галістаў раскрытыкавалі праект Артфё. Калі Сарказі пачаў дэпартацыю цыган, міністэрства ўвогуле абвінавацілі ў парушэнні рэспубліканскіх традыцый. Менавіта з вяртаннем ва ўрад галістаў-артадоксаў звязваюць аналітыкі цяперашнюю ліквідацыю канторы Брыса. Праўда, некаторыя кажуць, што калі рэйтынг Нацыянальнага фронту пачне расці, Сарказі можа рэанімаваць праект.

### ХАСЕ ЛУІС РАДРЫГЕС САПАТЭРА



Прэм'ер Іспаніі, старшыня Іспанскай сацыялістычнай рабочай партыі (PSOE) падключыўся да выбарчай кампаніі ў парламент Каталоніі. Выбары прызначаныя на 28 лістапада. Сапатэра выступае на мітынгах і сустракаецца з выбаршчыкамі. Пры гэтым ён робіць стаўку на незвычайныя для мясцовага піяру прыёмы — крытыкуе Ватыкан і асабіста Бенедыкта XVI. Па словах палітыка, перамога на выбарах правых партый будзе значыць пераход краю пад прамы дыктат касцёлу. Такая атэістычная рыторыка стала працягам надаўняй спрэчкі з лідэрамі кансерватыўнай Народнай партыі. «Народнікі» патрабавалі, каб лідэр дзяржавы ўзяў удзел у імшах, якія правёў Папа падчас надаўняга візіту ў Іспанію. На гэта Сапатэра заявіў, што «мусіць падпарадкоўвацца не Бенедыкту, а праву». Ён увогуле з'ехаў з краіны, як толькі туды прыляцеў Папа (палітык і клірык паспелі 10 хвілін паразмаўляць у аэрапорце). Цяжка сказаць, ці дапаможа сацыялістам гульня ў антыклерыкалізм. Больш левыя партыі крытыкуюць PSOE за тое, што Сапатэра адмовіўся адкласці разгляд закону аб прыбранні царкоўнай сімволікі з публічных месцаў.

ПАСЛЯ ПАДЗЕІ

# «ЛІСТАПАД»: ПЕРШАЯ ВОСЕНЬ ЮНАЦТВА

Андрэй РАСІНСКІ

**Гісторыя кінафэсту «Лістапад» — як гісторыя незалежнай Беларусі. На 17-м годзе жыцця за рытуальнымі «саюзнымі» цырымоніямі хаваецца супрацьлеглы змест.**



«Масакра» Андрэя Кудзіненкі



«Прагульшчыкі»

17 Міжнародны кінафестываль «Лістапад», што праходзіў на мінулым тыдні ў сталіцы Беларусі, здзівіў энергічнай і вольналюбівай праграмай, якую не здольныя пахаваць настальгічныя парэшткі савецкіх цырымоній.

«Лістапад» нарадзіўся сямнаццаць гадоў таму, дзякуючы Беларускаму саюзу кінематаграфістаў. Праз год Міністэрства культуры ўзяло фестываль пад свой кантроль. А на мяжы 2000-х «Лістапад» перайшоў пад апеку прэзідэнцкай адміністрацыі. Здавалася, кінематаграфічны фэст канчаткова пераўтварыўся ў настальгічную савецкую тусоўку, дзе найбольшая пашана аддавалася расійскаму старэйшаму брату.

На фэсце выкарыстоўваліся выбарчыя тэхналогіі, якімі славіцца Беларусь. Галоўным прызам фэсту заставаўся прыз глядацкіх сімпатый. Таму пільныя настаўніцы заганялі школьнікаў галасаваць за беларускую стужку «**На спіне ў чорнага ката**», дзе ў галоўнай дзіцячай ролі знялася ўнучка першага прэзідэнта. (Хаця фільм быў настолькі правальным, што да першага месца не дацягнуў, — рэнамэ фэсту было сапсаванае.)

Але выглядала, што псаваць ужо і няма чаго. Крытыкі і гледачы абміналі пляцоўкі, дзе са сцэнаў чытаўся верш «**Паклёпнікам Расіі**» і дэманстраваліся стужкі саюзнай дзяржавы.

На 17-м годзе ўсё змянілася.

Фэст яшчэ адкрываецца «саюзнай» стужкай «**Брэсцкая крэпасць**» — але фільм ужо па-за конкурсам.

Яшчэ вядоўцы, якія афіцыйна лічацца акцёрамі, — культурна запрашаюць на сцэну «Пал Палычаў» — але ёсць ужо і Арнэла Муці, у зялёнай сукенцы і з беласнежнай усмешкай, актрыса па ўмоўчванні.

Яшчэ ёсць нейкі няўцямны «саюзны» прыз за кадры «спальвання нашых савецкіх пашпартоў», але гаворка ідзе пра дакументальную стужку «35х45», дзе рэжысёр назаўжды развітваецца з савецкай эпохай. (Зрэшты, гэта стужка атрымала ўзнагароду за лепшы кароткаметражны неігравы фільм).

І зусім ужо выклікам колішняй настальгіі гучыць вырак прафесійнага журы на чале з літоўскім рэжысёрам Шарунасам Бартасам. Гран-пры фэсту атрымлівае фільм Сяргея Лазніцы «**Шчасце маё**». Падчас фестывальных праглядаў гледачы — пераважна старога веку — заклікалі расстраляць рэжысёра, а пасля фільму доўга знаходзіліся ў прастрацыі.

Не даводзіцца сумнявацца, што калі б Лазніца вырашыў падаць на «Беларусьфільм» сваю заяўку пра дальнабойніка, які заглыбляецца ў сэрца цемры, — то адразу быў бы арыштаваны за «дыскрэдытацыю Рэспублікі Беларусь», а ветэраны наладзілі б спальванне партрэтаў рэжысёра пад ягонымі вокнамі.

Але на «Лістападзе» міністр культуры Латушка асабіста аддаў Гран-пры, хаця і выглядаў крыху здзіўленым. З сёлетняга фэсту галоўныя ўзнагароды — за прафесійным журы.

Адмысловы прыз фэсту дастаўся кіргізскай карціне «**Выкрадальнік святла**» Актана Арыма Кубата — пра добрага электрыка, які крадзе святло для вяскоўцаў. Падзеі ў фільме разгортваюцца напярэдадні «цюльпанавай рэвалюцыі», карціна насычаная вітальнай энергіяй і народнай прагай справядлівасці.

Грузінскую карціну «**Прагульшчыкі**» сваёй узнагародай адзначылі крытыкі. Пранізлівая трагікамедыя Левана Кагуашвілі пра наркаманаў-недарэкаў выклікала здзіўленне ў беларускіх гледачоў: «У Грузіі даюць грошы на такія шчырыя і сумленныя стужкі? Якія не баяцца паказваць праўду?»

Праўду расказвае і дакументальная карціна «**Жанчына з пяццю сланамі**» (Гран-пры конкурсу неігравога кіно). Гераіня стужкі — перакладчыца Дастаеўскага, ураджэнка сталінскай Украіны. Па вайне яна апынулася ў Германіі. Пакручасты лёс перакладчыцы далёкі ад плакатаў «барацьбы савецкага народу ў Вялікай Айчыннай вайне».

Неігравая карціна «**Днюка**» беларускага рэжысёра Андрэя Куцілы знятая на апальным «Белсаце». Фільм пра старых у палескай вёсачцы адзначылі крытыкі, а журы конкурсу маладога неігравога кіно ўзнагародзіла фільм дыпломам «за ўніверсальнасць рэжысёрскай прафесіі».

А кароткі фільм Марцэля Лазіньскага «**Да запатрабавання**» пра лісты, якія немагчыма даставіць, — геніяльная дакументальна-паэтычная прыпавесць пра жыццё і Бога.

Увогуле, у фестывалю ўпершыню з'явіўся свой твар і свае дакладныя праграмы.

Маюцца ігравая і дакументальныя секцыі. У асноўным конкурсе — стужкі постсацыялістычных краінаў: Венгрыі, Балгарыі, Румыніі, Польшчы, Сербіі. У конкурсе дэбютаў — стужкі з усяго свету.

Перуанскі фільм «**Кастрычнік**» пра ліхвяра, якому падкідаюць дзіця, атрымаў прыз за лепшы ігравы дэбют. Не саступае яму і аўстралійская стужка пра абарыгенаў — «**Самсон і Даліла**». Маладыя героі гэтай карціны прызнаюцца ў пачуццях праз творы — маляванне і музыку.

Фільм маладога рэжысёра Алівера Лакса «**Усе вы капітаны**» заслужыў спецыяльны дыплом «за танец з рэальнасцю». Героі і акцёры гэтай стужкі — праблемныя дзеці з мараканскай кінамайстроўні, якую арганізаваў рэжысёр у Танжэры. Дзеці самі здымаюць фільм, а рэжысёр назірае і дапамагае гэтай творчасці. Іспанскі творца, які нарадзіўся ў Парыжы, а вучыўся ў Лондане, наведаў Мінск і расказаў пра сваю стужку.

Фестываль наведаў і Эмір Кустурыца. Слынны рэжысёр сустрэўся з кіраўніком дзяржавы і даў майстар-клас у Акадэміі мастацтваў. Візіт Кустурыцы выклікаў папрокі ў заўзятараў палітычнай чысціні, якія абвінавацілі рэжысёра ў палітычным невуцтве. Але творца, які называе сябе «праваслаўным сацыялістам» і сімпатызуе левым, распавядаў пра жыццё і мастацтва.

Дасціпныя показкі з жыцця ўвайшлі ў аўтабіяграфічную кнігу Кустурыцы, якая неўзабаве павінна выйсці з друку. На сустрэчы са студэнтамі высветлілася, што дзесьці ў беларускай правінцыі аматары рэжысёра здымаюць ігравы фільм «**Дазваніцца да Кустурыцы**». Кустурыца быў крануты, але калі ў яго запыталіся, колькі будзе каштаваць ягоны прыезд у беларускае мястэчка, каб завяршыць карціну, творца адсек: «Я за грошы не прылятаю».

Лукашэнка прапанаваў Кустурыцы зняць кіно на «Беларусьфільме». Але творца зараз збіраецца ставіць кіно з сюжэтамі Дастаеўскага.

На фэсце Кустурыца палуднічаў з беларускімі рэжысёрамі — Аляксандрам Колбышавым і Андрэем Кудзіненкам, які таксама думае пра варыяцыі Дастаеўскага.

Акрамя творчых сустрэч і асноўнага конкурсу — на фэсце для гледачоў мелася пяць дадатковых кінапраграмаў на любы густ (не гаворачы ўжо пра фестываль дзіцячых стужак «Лістападзік»).

Расійскае кіно, якое на мінулых «Лістападах» дамінавала, было вылучана ў асобны блок. Людміла Гурчанка, якая адзначае 75-гадовы юбілей, дэбютавала ў рэжысуры карцінай «**Пярэстае змярканне**». Актрыса асабіста прадставіла стужку.

Гледачы маглі пабачыць і скандальнага «**Качагара**» Аляксея Балабанава дый медытацыйных «**Аўсянак**» Аляксея Фядорчанкі.

За беларускае кіно на фэсце ўпершыню не было сорамна. «**Масакра**» Андрэя Кудзіненкі ўзнагарод не ўзяла, хаця ішла гутарка пра тое, каб вылучыць яе візуальнае афармленне. Але дасціпны «бульба-хорар» прагне жанравых фэстаў.

У праграме «Экстрым і Канаманія» публіка здзіўлялася дэбюту 21-гадовага Ксаўе Далана, які зняў стужку з правакацыйнай назвай «**Я забіў сваю маці**». Зачароўвала сваёй нязвыклай паэзіяй філіпінская «**Незалежнасць**». А пасля ёрніцкага «**Ікла**», сцэны якога былі на мяжы фолу, раз'юшаная пенсіянерка накінулася на крытыкаў з лямантам: «Як такое на экран выпусцілі!»

Глядацкае журы ўпадабала індыйскую меладраму «Удаан» і венесуэльскага «Брата», якому і дасталіся найбольшыя сімпатыі публікі.

Але «Лістапад» прайшоў пад знакам гратэскна-ачышчальнага «**Шчасця майго**». Прызы прафесійнага журы сталіся найгалоўнымі.

Як падкрэсліў на круглым стале слынны кінакрытык і дырэктар Расійскага інстытуту культуралогіі Кірыл Разлогаў, «Лістапад–2010» узмацніўся, адбыўся, і адбыўся менавіта як фестываль сусветнага кіно.

Сёлетні «Лістапад» можна лічыць узорам лукашэнкаўскай лібералізацыі, якая не патрабуе шмат, а іміджавы выйгрыш вялікі. Прафесіяналам не заміналі займацца сваёй справаў — і вынікі не прымусілі сябе доўга чакаць: свята кіно, сустрэчы з майстрамі, банкеты кінагурманства.

«Лістапад» дасягнуў юнацтва, калі на вуліцы восень. Ён не думае бунтаваць — і паслухмяна згаджаецца на рэшткі старых цырымоній. Але ягонае сэрца ўжо належыць Еўропе — і вольнай Беларусі.

РЭЦЭНЗІЯ

# КАШМАРЫ ШТОДЗЁННАГА КАНФАРМІЗМУ

Андрэй КРЫНІЦЫН

**Карціна Рубэна Остлунда «Добраахвотна-прымусова», што была на фэсце «Лістапад», затрымалася ў Мінску.**



*У фільме кашмары штодзённага канфармізму, заручаныя з людскім глупствам. Стужка цягне на дзве з паловай зорачкі з пяці.*

Сяброўкі-школьніцы балбочуць абы пра што, выпіваюць і фатаграфуюцца ў кампраментоўных позах. Маладыя хлопцы таксама любяць напіцца — і патураюць уласнай дурноце. Настаўніца дарэмна спрабуе дапамагчы вучню, якога цкуе іншы настаўнік. Нарэшце, кіроўца аўтобуса бярэ ў закладнікі пасажыраў, якія сапсавалі маёмасць.

Карціна Рубэна Остлунда — некалькі пераплеценых гісторый, аб'яднаных глупствамі і побытавым прыстасавальніцтвам. Што прымушае людзей рабіць дурноту — калі не грамадскі ціск і ўласная «памяркоўнасць»? У кадрах, адстаронена знятых адным планам, п'яныя школьніцы чапляюцца да пасажыра, дзяўчынка хлусіць, насуперак уласным перакананням, п'яныя бугаі дурэюць — і здзекуюцца са сцяга краіны (і ўласнага цела).

Відовішча непрыемнае. А што вы хочаце?

СПАДЧЫНА

# ШМАТПАКУТНЫЯ КРЫЖЫ БЕЛАРУСІ

Таццяна УЛАСЕНКА

**Хрыстос казаў: «Вазьмі крыж свой і кроч за мной». Гэта крыж кожнага чалавека — асобнага, непаўторнага. Але існуе і крыж народа, нацыі. І кожная нацыя, пэўна, мае свой крыж — спрадвечны сімвал, які яе беражэ.**

У крыжоў Беларусі свае адметныя, нярэдка драматычныя, лёсы і гісторыя. У дахрысціянскія часы крыжы, высечаныя на валунах, выконвалі ролю абярэгаў. Значна пазней, ужо ў хрысталюбівай Беларусі, крыжы ставіліся на ўскрайках вёсак і аберагалі жыхароў ад шматлікіх навалаў — хвароб, стыхій, пажараў. Крыжы, пастаўленыя на могілках і месцах масавых пахаванняў у новыя часы, ушаноўваюць памяць і аберагаюць спакой памерлых, забітых, расстраляных.

Гэтыя нарысы пра шматпакутныя крыжы. Іх выкарчоўваюць, паляць, знішчаюць. Такіх крыжоў шмат у Беларусі. Хто іх баіцца, чаму знішчаюць — пра вечнае супрацьстаянне беларускай грамадскасці з непрыхаваным дзяржаўным вандалізмам чытайце ў нашай серыі артыкулаў. А пачнём мы з самага спрадвечнага і шматпакутнага крыжа Беларусі.





Крыж Ефрасінні Полацкай

## КРЫЖ ЕФРАСІННІ ПОЛАЦКАЙ

Выраблены ў 1161 годзе Лазарам Богшам па заказе святой Ефрасінні Полацкай — князёўны, асветніцы, духоўнай і грамадскай дзяячкі, шасціканцовы крыж для беларусаў стаўся не проста святой рэліквіяй і абярэгам, але і магутным сакральным сімвалам, увасабленнем пакутніцкага лёсу Беларусі.

Калі спалучыць значную частку гісторыі нашай зямлі з лёсам святой рэліквіі, яе выкраданнем, псаваннем, таямнічым знікненнем, то можна здагадацца, што з'яўленне на Беларусі крыжа-абярэга абумоўлівалася не толькі духоўнымі памкненнямі Ефрасінні, але, на мой погляд, было яшчэ і своеасаблівым палітычным захадам славутай хрысціянкі. Бо рэлігія ў той час аказвала вельмі моцны ўплыў на ўнутраную і знешнюю палітыку дзяржаваў. Крыж павінен быў аб'яднаць і абараніць беларусаў. І Беларусі патрэбен быў не проста святы абярэг, а менавіта сакральны сімвал.

Чуткі пра крыж і яго ўздзеянне на вернікаў разнёсся далёка за межы краіны. Аздоблены каштоўнейшымі камянямі і металамі, шматлікімі эмалевымі абразкамі, срэбнымі з пазалотай пласцінамі, на ім, апроч іншых шыкоўных дэталяў, змяшчаўся кароткі надпіс-праклён, адрасаваны вандалам. Упершыню імі сталі ў XVI стагоддзі паслугачы князя Васіля III, якія скралі крыж і вывезлі ў Маскву. Рабаўніцтва і пагромы на чужых землях у тыя і ў пазнейшыя часы былі асноўнай формай вынаходніцтва і промыслу ўсходняга суседа.

Падчас Лівонскай вайны Іван Жахлівы па невядомай прычыне вырашыў вярнуць святыню ў Полацк — гэта пасля ўчыненых ім у гэтым горадзе крывавых бойняў. Тады вернікі-ўніяты сталі больш пільна аберагаць крыж у Сафійскім саборы не толькі ад чужынцаў, але і ад езуітаў, якія таксама рабілі спробу выкрасці рэліквію.

Самыя вялікія пакуты выпалі на славуты шэдэўр Лазара Богшы падчас усталявання ў Беларусі камуністычнай улады. У 1921 годзе асобным загадам вынішчаліся, рабаваліся і вывозіліся за мяжу ўсе нацыянальныя беларускія каштоўнасці, большасць з якіх трапіла ў Маскву. Спустошваліся музеі, бібліятэкі навучальных устаноў, цэркваў, сабораў, касцёлаў.

Сёння дакладна не вядома, дзе знаходзіцца крыж. Па афіцыйнай версіі — рэліквія была скрадзена нямецкімі акупантамі ў 1941 годзе. Аднак, улічваючы характар «нагляду» за святыняй з боку пэўных асобаў партыі, АГПУ, НКУС, пачынаючы з 1921 года, а таксама прааналізаваўшы гісторыю вымушанага і гвалтоўнага перамяшчэння крыжа па бязмежных прасторах «чырвонай імперыі», больш актуальнай і праўдзівай з'яўляецца версія аб пераправе яго камуністамі праз мяжу на Усход, а калі дакладней, у Маскву.

Ужо на пачатку 1920-х гадоў шэдэўр ювелірнага мастацтва, пабываўшы ў руках ваяўнічых атэістаў, меў жахлівы выгляд і нагадваў сапраўдную ахвяру вандалізму, на «целе» якой праступалі паламаныя і папсаваныя выявы святых, дзіркі ад выкалупаных каштоўных камянёў, адламаных кавалкаў золата і дрэва.

Адзінае, што бездакорна заставалася некранутым, — гэта надпіс, праклён таму, хто няшчыра абыдзецца з нацыянальнай святыняй, выкрадзе, альбо прадасць крыж. «...Хай не выносяць яго з манастыра ніколі, і не прадаюць, і не аддаюць. Калі не паслухаецца хто і вынесе з манастыра, хай не дапаможа яму святы крыж ні ў жыцці гэтым, ні ў будучым, хай пракляты будзе ён Святой жыватворнай Тройцаю ды святымі айцамі... і няхай спасцігне яго доля Юды, які прадаў Хрыста. Хто адважыцца ўчыніць такое... валадар або князь, або епіскап ці ігумення, або іншы які чалавек, хай будзе на ім гэты праклён. Ефрасіння ж, раба Хрыстова, якая справілі гэты крыж, набудзе вечнае жыццё з усімі святымі...»

Крыж Ефрасінні Полацкай да гэтага часу захоўвае сілу праклёну.

**Працяг будзе**

НАПЯРЭДАДНІ ПРЭМ'ЕРЫ

# НОВЫЯ ПЕСНІ, НОВЫЯ АДКРЫЦЦІ

**Беларуская дударская школа ідзе па шляху адраджэння сваёй музычнай самабытнасці і традыцый, якія ствараліся стагоддзямі. Таму кожны альбом з дударскай музыкай і сустракае гарачы водгук у публікі. Новы альбом гурта «Testamentum Terrae» знойдзе шмат прыхільнікаў у асяродках аматараў медыявільных пошукаў айчынных музыкантаў і даследчыкаў спадчыны наша народа. Пра новы дыск «Testamentum Terrae» музычны крытык Анатоль Мяльгуй гутарыць з лідэрам гурта і дударскім майстрам Юрасём Панкевічам.**

***— Юрась, у чым бачыце адрозненне першага альбома «Слаўны паніч» ад новай працы гурта — альбома «Angleza», як па рэпертуару, так і па гучанню? Чаму дыск мае такую незвычайную назву?***

— «Слаўны паніч» — гэта першы дыск, як першы блін, выйшаў амаль комам. Не столькі ён дрэнны, колькі спантанны: на першым дыску мы не планавалі матэрыял, а папросту запісалі тое, што гралі (канцэртны рэпертуар). Выйшла, як мне здаецца, няблага, але галоўнае — на першым дыску мы прадставілі наша адкрыццё беларускіх народных песенных скарбаў са збораў Міхала Федароўскага. І свой другі альбом мы вырашылі прысвяціць менавіта ягонай працы. А пачалося ўсё з адной кампазіцыі «Angleza», якая нас і натхніла. Цяжка ўявіць сёння бабулю, да якой прыехаў этнограф, а яна перад спевамі падаіла карову, працерла рукі і праспявала простыя і звычайныя словы: «Жар маці капусту, жар маці буракі, каб любілі хлапакі».

А напрыканцы дадала, што гэта «англеза» з крокам «праменада»! Нагадаю, што angleza — гэта збіральная назва танцаў, якія былі пашыраны ў Еўропе ў XVII–XIX стагоддзяў і паходзілі з Англіі. І, як бачым са збораў Федароўскага, яны бытавалі на тэрыторыі Беларусі. Эпоха Рэнесансу, шляхецкая культура ніколі не былі чужымі для нашага народу. Вось і назбіраў Міхал Федароўскі шэсць тамоў гэткай унікальнай культурнай спадчыны, якой мы скарысталіся. А самае добрае — што гэтых тамоў не кранали рукі савецкіх рэдактараў.

***— Колькі часу ішла праца над новым альбомам, і хто з музыкаў працаваў разам з вамі ў студыі?***

— Запісвацца мы пачалі на пачатку лета 2009 года. Праз некаторы час альбом быў поўнасцю складзены, а некаторыя кампазіцыі прайшлі «выпрабаванне гледачом» на канцэртах. Вялікі дзякуй за дапамогу ў студыі Паўлу Бельскаму — вельмі добраму гітарысту. Не адна яго ідэя аранжыровак увайшла ў наш альбом. Таксама мы выказваем сваю ўдзячнасць гукааператару Валерыю Шаўчэнку, які шмат чаго падказаў у студыі і зрабіў добры гук на альбоме «Angleza».

***— Хто дапамагае вам у выданні новага альбома і яго прэзентацыі?***

— Гэты альбом выходзіць, як і першая наша кружэлка, дзякуючы беларускай мецэнатцы са Злучаных Штатаў Амерыкі Ірэне Каляда-Смірноў, якая супрацоўнічае з Міжнародным грамадскім аб'яднаннем «Згуртаванне беларусаў свету «Бацькаўшчына». Таксама хачу падзякаваць за дапамогу кампаніі «Будзьма беларусамі» і прыватнаму прадпрыемству «Ковкастроймонтаж», якія падтрымалі выданне нашай кружэкі. Добра, што нашу культуры падтрымліваюць такія людзі, праз дапамогу якіх могуць быць рэалізаваныя падобныя культурныя праекты.

***— У гурта «Testamentum Terrae» ёсць і другое сцэнічнае аблічча і гучанне — электрычна-рокавае. Ці будзе яно адлюстравана на альбоме «Angleza», ці ёсць планы ў такім складзе запісаць фолк-рокавы альбом?***

— Калі-небудзь, можа, і зробім, але пакуль мы не дараслі да такой разнастайнасці. Нам не хапае прафесійных музыкаў менавіта рокавага стылю. Таму, калі нехта захоча да нас далучыцца і граць з намі беларускі фолк-рок, то мы заўжды будзем рады! Праўда, бывае так, што калі можаш добра граць у адным стылі, гэта не значыць, што добра зайграеш у другім. Мы вырашылі гэта пакінуць як забаву. І калі знойдуцца прафесіяналы ў гэтым стылі, можа мы паспрабуем яшчэ. Але нашу музычную забаву ніхто не адмяняе.



Шмат каму спадабаўся наш рэмікс «Па саду, саду», і я цяпер планую зрабіць праект электроннай музыкі, але для гэтага шукаю добрага ды-джэя.

***— Якія бліжэйшыя творчыя планы гурта «Testamentum Terrae»?***

— Пакуль адзіны і самы галоўны клопат — правесці прэзентацыю 28 лістапада, у якой з намі прымаюць удзел гурты «Рокаш», «Омут», «Кашлаты Вох». А самае цікавае для нас — гэта тое, што гэтыя гурты да прэзентацыі зробяць каверы на нашы кампазіцыі. Кожны гурт мусіць зрабіць па дзве кампазіцыі з нашых двух альбомаў. Можа, выдадзім іх асобным дыскам, бо вельмі цікава паслухаць старажытныя мелодыі ў розных інтэрпрэтацыях і ў розных стылях.



ЮБІЛЕЙ

# СВЯТА ЛЕГЕНДЫ

Аляксей ХАДЫКА

**24 лістапада а 17 гадзіне ў клубе «Рэактар» (вул. Харужай, 29) сваё 60-годдзе святкуе Генадзь Старыкаў.**

Маладое пакаленне, пэўна, не вельмі добра ведае лёс гэтай легенды беларускай эстрады, кампазітара і гітарыста. З ім пачыналіся першыя біт-фестывалі 1960-х у СССР і гурт «Алгарытмы», потым «Верасы», потым першае ў Мінску музычнае шоў «Парадыз» у кінатэатры «Масква», «Стар-клуб» з рэгулярнымі вечарынамі па серадах, на якіх прафесійна вырасла шмат больш маладых музыкаў.

Таму ў «Рэактары» ў атмасферы блюз-рок-джаза наведвальнікаў чакае чатыры гадзіны выключнай жывой музыкі і лепшыя выканаўцы ў названых напрамках у Беларусі. Пералік можна ўявіць сябе своеасаблівым залам славы айчыннай эстрады: Уладзімір Угольнік, «Крама», «White Night Blues» Юрыя Несцярэнкі, «Мадэра хард блюз», экс-пясняр Уладзімір Ткачэнка.

**Набыццё білетаў: 295 92 96, (8 029) 5577200, (8 029) 3355118.**




ВЫСТАВА

# УНУТРАНЫЯ LANDШАФТЫ

Аляксей ХАДЫКА

**17 лістапада ў Музеі сучаснага мастацтва (на рагу праспекта Незалежнасці і плошчы Якуба Коласа ў Мінску) адчынілася не зусім звычайная выстава «Унутраныя LANDшафты».**

Хаця сама па сабе выстава з'яўляецца часткай агульнанацыянальнага выставачнага праекта «Зямля пад белымі крыламі», пра які мы ўжо пісалі, яна відавочна стаіць трошкі паасобку ад мастацкага мэйнстрыму краіны.

Нават мантаж выставы пачынаўся незвычайна. 16 лістапада маю ўвагу прыцягнулі тры бабулі з кіёчкамі, якія перад вокнамі Музея жыва і зацікаўлена, як дзеці, спрабавалі зазірнуць у выставачныя памяшканні з вуліцы праз паўпрычыненыя жалюзі. «Што яны там выставілі!» — цікавіліся бабулькі. За вокнамі было відаць… старыя пашарпаныя і парослыя мохам вуллі…


Аляксей Хадыка з аўтарам ідэі вігвама Ігарам Тхэлам (якую ўвасобіла Алена Атрашкевіч)

За дзень да вулляў даданіся: вігвам з інсталяваным пры ім магнітафонам, які аднаўляе шум марскога прыбою (інсталяцыя Алены Атрашкевіч «Мары аб моры», 2010), вялікі блакітны паветраны шар з геліем, прычэплены да маленькага кампутарчыка, на экране якога плывуць аблокі (воблраз неба). Аркушы паперы на сцяне доўгім шэрагам, з напісанымі на іх кароткімі фразамі, якія апісваюць уражанне, што пакінула ў гледача рэальная карціна, калі б яна вісела на месцы аркуша з інскрыпцыяй. Праектар на пераходзе (зацемненым) з першага паверху на другі, да малой выставачнай залы, дэманструе на сцяне бліскі сонечных праменяў на паверхні вады.

Адным словам, адмысловымі нежывапіснымі, але музычнымі, аб'ёмнымі, інтэрактыўнымі сродкамі, інсталяцыямі, музей пераўтвараецца ў нейкае гарманічнае прыроднае асяроддзе. Дзе не хочацца грашыць па-дробнаму, таму на вернісажы гасцям прапаноўвалі замест звычайнага віна… бярозавік.

Зусім не дзіўна, што адкрыццё прыцягнула павышаную ўвагу і апрача проста гасцей яго наведаў амбасадар Францыі, першы намеснік міністра культуры і іншыя афіцыйныя асобы. Мастацтвазнаўца Ларыса Фінкельштэйн адразу на адкрыцці з захапленнем праводзіла экскурсію сваім студэнтам-дызайнерам. Засталося пералічыць аўтараў праекта (Алена Атрашкевіч, Дзяніс Барсукоў, Павел Вайніцкі (аднаразова куратар), Сяргей Ждановіч, Сяргей Завіжэнец, Дар'я Іваноўская, Ігар Саўчанка). А таксама паведаміць, што экспазіцыя працягнецца па 6 снежня, таму запрашаю чытачоў «НЧ» прыйсці ў гэты музей — атрымаць задавальненне.




Новы Час
Агульнапалітычная штотыднёвая газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар
Кароль Аляксей Сцяпанавіч

Зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі РБ. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.

**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.

**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў». Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220113, г. Мінск, вул. Мележа, 1–1234.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 268 52 81.
novychas@gmail.com; www.novychas.org

**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет». г. Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова № 1172

Падпісана да друку 19.11.2010. 8.00.
Наклад 6000 асобнікаў. Кошт свабодны.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы.
Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.